Гос. Пуб. Биб-ка Уз.С.С.Р.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 213 (6189) | 14 верасня 1938 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Гісторыя Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс. Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год.

Прызыў у РСЧА і Ваенна-Марскі Флот.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР.

І. Дабравіцкі, Г. Блюмкіна. — Самаабавязацельствы варашылаўцаў.

Н. Гіршын. — Соцспаборніцтва прадпрыемстваў Гомеля.

Зводка аб ходзе сельскагаспадарчых работ у калгасах па абласцях БССР.

Р. Сяргеенка. — Змяншаюць кошт працадня.

Тыповы статут вышэйшай навучальнай установы.

Абласная нарада старшынь сельсоветаў.

Маладыя кадры судовых работнікаў.

Шахматна-шашачны чэмпіянат БССР.

ЗА РУБЯЖОМ

Становішча ў Чэхаславакіі.

Генлейнаўскі путч у Чэхаславакіі.

Правакацыйны ўльтыматум генлейнаўцаў.

Заява чэхаславацкага ўрада.

Антыфашысцкая дэманстрацыя ў Чэхаславакіі.

Чэхаславацкі ўрад адвергнуў правакацыйны ультыматум генлейнаўцаў.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Адкрыўся пленум Лігі нацый.

Роспуск сейма і сената ў Польшчы.

Нота кітайскага ўрада Лізе нацый.

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ БОЛЬШЭВІЗМА

Выпуск Кароткага курса гісторыі Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), распрацованага Камісіяй ЦК ВКП(б), пры бліжэйшым удзеле таварыша Сталіна і адобранага ЦК ВКП(б), з'яўляецца велізарнейшай падзеяй у ідэйным жыцці нашай партыі і ўсяго міжнароднага комуністычнага руху.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) з'яўляецца навуковай гісторыяй вялікай партыі Леніна—Сталіна, які падымае на небывалую вышыню справу вывучэння гісторыі партыі.

Партыя, комсамол, працоўныя вялікага Совецкага Саюза атрымалі глыбокую па зместу навуковую працу, якая з усёй класічнай сталінскай глыбінёй, яснасцю і чоткасцю выкладу расказвае аб гераічнай барацьбе і перамогах партыі за справу Леніна—Сталіна. У кнізе Кароткага курса гісторыі партыі тэарэтычна абагулен увесь велізарнейшы вопыт нашай партыі, дадзена навуковае марксісцка-ленінскае растлумачэнне гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа за ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята, за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

«ВКП(б) вырасла,—гаворыцца ва ўводзінах Кароткага курса гісторыі ВКП(б),—на аснове рабочага руху ў дарэвалюцыйнай Расіі з марксісцкіх гурткоў і груп, якія звязаліся з рабочым рухам і ўнеслі ў яго соцыялістычнае сазнанне. ВКП(б) кіравалася і кіруецца рэвалюцыйным вучэннем марксізма-ленінізма. Яе правадыры ў новых умовах эпохі імперыялізма, імперыялістычных войн і пролетарскіх рэвалюцый развілі далей вучэнне Маркса — Энгельса, паднялі яго на новую ступень.

ВКП(б) расла і мацнела ў прынцыповай барацьбе з дробнабуржуазнымі партыямі ўнутры рабочага руху—эсэрамі (а яшчэ раней з іх папярэднікамі—народнікамі), меншавікамі, анархістамі, буржуазнымі нацыяналістамі ўсіх масцей, а ўнутры партыі з меншавіцкімі апартуністычнымі плынямі,—трацкістамі, бухарынцамі, нацыянал-ухілістамі і іншымі антыленінскімі групамі.

ВКП(б) мацнела і гартавалася ў рэвалюцыйнай барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа, з усімі ворагамі працоўных — памешчыкамі, капіталістамі, кулакамі, шкоднікамі, шпіёнамі, з усімі наймітамі капіталістычнага акружэння».

Гісторыя нашай слаўнай большэвіцкай партыі, якую стварылі і выпеставалі правадыры сусветнага пролетарыята Ленін і Сталін—гэта непераможны шлях авангарда рабочага класа, які з высока паднятым сцягам Маркса і Энгельса заваяваў свабоду і шчасце народам нашага вялікага Совецкага Саюза, пабудаваўшы ў асноўным соцыялістычнае грамадства на адной шостай частцы зямнога шара.

Наша партыя і яе правадыры таварышы Ленін і Сталін заўсёды адлавалі выключнае значэнне рэвалюцыйнай тэорыі, якая неразрыўна звязана з рэвалюцыйнай практыкай.

«...Тэорыя робіцца безпрадметнай, калі яна не звязваецца з рэвалюцыйнай практыкай, таксама як і практыка робіцца зляпой, калі яна не асвятляе сабе дарогу рэвалюцыйнай тэорыяй. Але тэорыя можа ператварыцца ў найвялікшую сілу рабочага руху, калі яна складваецца ў неразрыўнай сувязі з рэвалюцыйнай практыкай, бо яна, і толькі яна, можа даць руху ўпэўненасць, сілу арыентыроўкі і разуменне ўнутранай сувязі акружаючых падзей, бо яна, і толькі яна, можа дапамагчы практыцы зразумець не толькі тое, як і куды рухаюцца класы ў сучасным, але і тое, як і куды павінны рухацца яны ў бліжэйшым будучым». **(Сталін).**

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) з усёй яснасцю паказвае тое **новае**, што ўнёс геній Леніна ў скарбніцу марксізма, паказвае як Ленін у жорсткай барацьбе з усімі ворагамі большэвізма стварыў марксісцкую партыю, партыю новага тыпу, партыю большэвікоў. У кнізе з усёй глыбінёй паказана ленінска-сталінскае **вучэнне аб партыі.**

Вывучаючы Кароткі курс гісторыі ВКП(б), партыйныя і непартыйныя большэвікі яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол непараможнага спятага Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі. Вывучэнне гісторыі ВКП(б) будзе спрыяць падняцію рэвалюцыйнай пільнасці, ідэйнай узброенасці і боездольнасці комуністаў, комсамольцаў і ўсіх працоўных.

Нашай партыі і працоўным у барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства прадстаяць жорсткія баі супроць агентаў капіталістычнага акружэння, супроць фашысцкіх падпальшчыкаў крывавай вайны. Гэта абавязвае кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка няўтомна авалодваць марксізмам-ленінізмам, усямерна павышаць сваю ідэйную ўзброенасць.

Кожны комуніст павінен пранікнуцца ўсведамленнем таго, што засваенне гісторыі ленінска-сталінскай партыі, авалоданне большэвізмам з'яўляецца яго партыйным абавязкам і доўгам перад народам, бо без гэтага комуністы не могуць з поспехам ажыццяўляць сваю ганаровую і адказную ролю арганізатараў і кіраўнікоў мас у барацьбе за канчатковую пабудову комуністычнага грамадства.

Паяўленне Кароткага курса гісторыі ВКП(б) выклікала небывалую зацікаўленасць сярод комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных. На кожным заводзе, фабрыцы, калгасе, установе з вялікай прагнасцю пачалі вывучаць гісторыю нашай большэвіцкай партыі.

Цяга да вывучэння гісторыі партыі вялікая. Задача партыйных кіраўнікоў заключаецца ў тым, каб ахапіць вучобай усіх комуністаў, забяспечыць рэгулярную работу школ і гурткоў, забяспечыць сетку партыйнай асветы падрыхтованымі прапагандыстамі. Побач з гэтым, шырока практыкаваць арганізацыю лекцый, дакладаў, бясед аб гісторыі ВКП(б) для членаў і кандыдатаў партыі, спачуваючых і беспартыйных актывістаў.

Партыйныя кіраўнікі, сакратары абкомаў, гаркомаў, райкомаў павінны не толькі арганізоўваць вывучэнне гісторыі партыі, але і самі глыбока яе вывучаць, асабіста кіраваць заняткамі ў школах партыйнага актыва.

Трэба раз і назаўсёды пакончыць з няправільнымі размовамі асобных партыйных кіраўнікоў аб тым, што «мне няма часу займацца ў школе, бо я перагружан іншымі работамі». Партарганізацыі абавязаны ліквідаваць недахопы, якія яшчэ ёсць у справе разгортвання партыйнай прапаганды.

Асобныя сакратары абкомаў, гаркомаў і райкомаў займаюцца партыйнай вучобай ад выпадку да выпадку, у большасці сваёй тады, калі неабходны весткі аб становішчы партыйнай прапаганды. У Будакашалёўскім раёне ў радзе партыйных школ сістэматычна зрываюцца заняткі, а летам нават зусім спыніліся. У дні вучобы склікаюцца розныя сходы, прапагандыстаў адклікаюць на іншыя работы, і на ўсё гэта райком партыі не рэагуе.

Сакратар Даманавіцкага райкома партыі тав. Гуцаў на пытанне прадстаўніка Палескага абкома аб становішчы партыйнай прапаганды заявіў:

— Што вы лезеце з пытаннем аб партыйнай вучобе. Вам, як відаць, рабіць няма чаго. Калі спраўлюся з усімі работамі, тады буду займацца партвучобай.

Такія размовы няправільныя. Партыйны кіраўнік абавязан узначаліць імкненне комуністаў да вывучэння гісторыі ВКП(б), дапамагчы ім авалодаць большэвізмам.

Партыйныя і непартыйныя большэвікі Беларусі — фарпоста Совецкага Саюза на граніцы з капіталістычным светам — будуць выхоўвацца на слаўных старонках гісторыі ВКП(б), яшчэ вышэй падымаць свой ідэйны ўзровень, няўтомна адточваць сваю рэвалюцыйную пільнасць, каб да канца выкарчаваць трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў.

Вывучэнне гераічнага мінулага ВКП(б), вывучэнне гісторыі барацьбы партыі з усімі ворагамі будзе гартаваць нашы кадры ў духу большэвізма, яшчэ больш згуртоўваць народы нашай неабсяжнай радзімы вакол вялікага прадаўжальніка справы Леніна, арганізатара і кіраўніка большэвіцкай партыі, правадыра працоўных усяго свету — таварыша Сталіна.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ГЕНЛЕЙНАЎСКІ ПУТЧ У ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 13 верасня. (БЕЛТА). У ночна 13 верасня генлейнаўцы арганізавалі ў Судэцкай вобласці путч. Пачынаючы з 12 гадзін ночы, у 40 пунктах Заходняй Чэхіі — паміж Хэбам і Усці над Лабем — адбыліся ўзброеныя выступленні чэхаславацкіх гітлераўцаў. Усе гэтыя выступленні насілі арганізаваны характар і кіраваліся, як відаць, з адзінага цэнтра. У радзе пунктаў генлейнаўцам удалося захапіць у свае рукі пошту, тэлеграф, перарэзаць тэлеграфную і тэлефонную сувязь з Прагай, арыштаваць начальнікаў чыгуначных станцый, пошты, чыгуначных служачых і пагранічную варту. Адначасова генлейнаўцы пачалі пагромы супроць яўрэйскага і чэшскага насельніцтва, тэрарыстычныя акты супроць антыфашыстаў, правакацыі ўзброеных сутычак з дэмакратычным насельніцтвам. У Красне Бржэзно генлейнаўцамі была арганізавана «дэманстрацыя», пасля сканчэння якой з радоў дэманстрантаў раздаліся два правакацыйныя выстралы, у рэзультаце чаго з ліку стаяўшых на тратуары былі забіты немец і чэх. У другім горадзе пры ўступленні войск выстралам з акна аднаго будынка быў забіт салдат. Буйныя сутычкі мелі месца апрача Хэба таксама ў Карлавых Варах (Карлсбадзе), Шумперку і ў іншых гарадах. У двух месцах на саксонскай граніцы генлейнаўцы прапусцілі з Германіі цераз граніцу каля 2 тысяч адборных ахраннікаў (СС) і членаў «судэта-нямецкага легіёна».

Пры дапамозе паліцыі, жандармерыі, а ў некаторых месцах і рэгулярных войск путч быў ліквідаван. Барацьба прадаўжалася некалькі гадзін. Варта адзначыць, што паліцыя і вайсковыя часці дзейнічалі супроць путчыстаў, не прымяняючы, згодна распараджэння з цэнтра, зброі.

Да поўдня 13 верасня ва ўсіх пунктах, дзе мелі месца генлейнаўскія выступленні, адноўлен парадак. Урад выдаў распараджэнне аб увядзенні ў 8 акругах надзвычайнага становішча, пры якім дзейнічае асобы суд, які мае права асуджаць за антыдзяржаўныя выступленні да кары смерцю. У гэтыя акругі накіраваны рэгулярныя войскі.

Як удалося пакуль устанавіць, у кіраўніцтве путчам прымаў удзел рад генлейнаўскіх дэпутатаў парламента. Есць весткі аб тым, што сёння генлейнаўцы рыхтуюць выступленні ў гарадах Ліберэц, Усці над Лабем, у Хомутаве і ў іншых.

Усе даныя гаворыць аб тым, што генлейнаўскія путчысты прыступілі да рэалізацыі так званага «іспанскага варыянта». З асвядомленых крыніц паведамляюць, што на германскай граніцы праходзіць узмоцненая канцэнтрацыя войск.

ПРАВАКАЦЫЙНЫ ЎЛЬТЫМАТУМ ГЕНЛЕЙНАЎЦАЎ

ПАРЫЖ, 13 верасня. (БЕЛТА). У Парыжы атрыманы весткі аб тым, што кіраўніцтва судэта-нямецкай партыі адправіла ў 17 гадзін 30 мінут главе чэхаславацкага ўрада ультыматум, у якім патрабуе адмены надзвычайнага становішча, абвешчанага ў васьмі акругах Судэцкай вобласці, адклікання з Судэцкай вобласці дзяржаўнай паліцыі, перадачы паліцэйскіх функцый мэрам гарадоў і абшчын Судэцкай вобласці. Як перадаюць, тэлеграма падпісана Генлейнам, Кундтам, Себекоўскім. У тэлеграме гаворыцца, што невыкананне гэтых патрабаванняў у 6-гадзінны тэрмін ускладзе на чэхаславацкі ўрад адказнасць за ўсе далейшыя падзеі, якія могуць адбыцца. (БЕЛТА).

ЗАЯВА ЧЭХАСЛАВАЦКАГА ЎРАДА

ЛОНДАН, 13 верасня. (БЕЛТА). Дыпламатычны аглядальнік газеты «Ўінінг стандард», закранаючы заяву, уручаную ўчора чэхаславацкім пасланнікам у Лондане Масарыкам англійскаму міністэрству замежных спраў, піша:

«У гэтай заяве чэхаславацкі ўрад падрабязна падкрэслівае ўсе тыя канчатковыя ўступкі, на якія ён можа пайсці для задавальнення патрабаванняў генлейнаўцаў. У заяве ўказваецца, што гэтыя ўступкі з'яўляюцца мяжой, далей якой чэхаславацкі ўрад пайсці не можа. Чэхаславацкі ўрад папярэдзіў, што правядзенне плебісцыта ў Судэцкай вобласці несумяшчальна з цэласнасцю чэхаславакіі».

АНТЫФАШЫСЦКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 12 верасня. (БЕЛТА). Учора ў адказ на правакацыі генлейнаўцаў па ўсёй Чэхаславакіі зноў пракацілася хваля антыфашысцкіх дэманстрацый. Цэнтральным лозунгам, аб'ядноўшым дзесяткі тысяч працоўных — удзельнікаў дэманстрацыі, быў: «Не сладзімся!».

Найбольш буйнаю была дэманстрацыя, якую арганізавала чэшская соцыял-дэмакратычная партыя ў г. Пільзене. У дэманстрацыі прымала ўдзел 50 тысяч чалавек. На мітынгу, які адбыўся пасля дэманстрацыі, выступаў старшыня партыі чэшскіх соцыял-дэмакратаў Гампль, які заявіў, што апошнія прапановы ўрада — «мяжа ўступак; далей мы не адступім ні на крок!».

У дэманстрацыях прымалі ўдзел усе антыфашысцкія партыі. На ўсіх мітынгах былі прыняты рэзалюцыі, дэманструючыя волю народных мас адстаяць незалежнасць і цэласнасць рэспублікі і яе дэмакратычны лад.

ЧЭХАСЛАВАЦКІ УРАД АДВЕРГНУЎ ПРАВАКАЦЫЙНЫ ЎЛЬТЫМАТУМ ГЕНЛЕЙНАЎЦАЎ

ЛОНДАН, 14 верасня. (БЕЛТА). Пражскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што чэхаславацкі ўрад адвергнуў правакацыйны ўльтыматум генлейнаўцаў, адначасова заявіўшы, што дзверы для далейшых перагавораў застаюцца адкрытымі.

ПРАГА, 13 верасня. (БЕЛТА). Сёння к канцу дня было выдана распараджэнне ўрада аб распаўсюджанні надзвычайнага становішча на акругу Краслісэ.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

На паўднёвым беразе ракі Янцзы ў сектары Жуйчан японцы вядуць наступленне па лініі Жуйчан—Янсінь (на захад ад Жуйчана). Аднак японскім войскам прасунуцца не ўдалося. На Янцзы каля Матоўчжэнь былі сур'ёзна пашкоджаны 7 японскіх ваенных суднаў. Адно з іх патанула. У сектары Сіньцзы (Нанькан) ідуць жорсткія баі. Кітайскія войскі тут перайшлі да актыўнай абароны і сваімі контратакамі адкінулі праціўніка на зыходныя пазіцыі.

Горны характар мясцовасці на паўднёвым беразе Янцзы затрудняе скарыстанне японскай ваеннай тэхнікі.

Японцы амаль штодня ўжываюць атрутныя газы не толькі пры наступленні, але і пры адступленні.

11 верасня пасля жорсткага бою кітайскім войскам удалося знішчыць японскі дэсант, які высадзіўся некалькі дзён таму назад на паўднёвым беразе Янцзы ніжэй Аньцына. Кітайцамі захоплены вялікія трафеі. 10 верасня кітайская берагавая артылерыя абстраляла караван японскіх транспартаў і ваенных суднаў на Янцзы ў раёне Сянькоу, ніжэй Пынцзэ. Сур'ёзна пашкоджаны 5 японскіх суднаў. У гэты-ж дзень былі патоплены і спалены яшчэ два японскія судны.

АДКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 12 верасня. (БЕЛТА). Сёння адкрыўся пленум Лігі нацый. На вячэрнім пасяджэнні пленума старшынёй быў выбран Дэ Валера (Ірландыя). Пленум зацвердзіў даклад мандатнай камісіі. Паводле паведамлення апошняй, у пленуме ўдзельнічаюць дэлегацыі 48 дзяржаў.

Ад СССР прысутнічае дэлегацыя ў саставе тт. Літвінава, Майскага і Сурыца (дэлегаты), Мегекалава і Калантай (намеснікі дэлегатаў).

Пленум выбраў камітэт, які выставіць кандыдатуры ў бюро пленума. У гэты камітэт увайшоў тав. Сурыц.

Віцэ-старшынямі пленума выбраны першыя дэлегаты СССР (т. Літвінаў), Вялікабрытаніі, Францыі і некаторых іншых дзяржаў.

У АПОШНЮЮ МІНУТУ

НОТА КІТАЙСКАГА ЎРАДА ЛІГЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 12 верасня. (БЕЛТА). Кітайскі ўрад прыслаў Лізе нацый ноту з патрабаваннем неадкладнага прымянення 17 артыкула статута Лігі нацый у адносінах да Японіі. (Арт. 17 статута Лігі нацый прадугледжвае прымяненне санкцый супроць агрэсара—не члена Лігі нацый, які прыбягае да вайны супроць членаў Лігі нацый).

РОСПУСК СЕЙМА І СЕНАТА Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 13 верасня. (БЕЛТА). Сёння дырэктар бюро прэзідыума совета міністраў маёр Лепецкі ўручыў старшыні польскага сейма палкоўніку Славеку і віцэ-старшыні сената Баранскаму дэкрэт прэзідэнта Польшчы Масціцкага аб датэрміновым роспуску **сейма і сената.**

ПРАМОВА ГІТЛЕРА

БЕРЛІН, 13 верасня. (БЕЛТА). Учора вечарам на закрыцці нюрэнбергскага «з'езда» германскіх фашыстаў Гітлер сказаў прамову, у якой былі рэзкія выпады і пагрозы супроць Чэхаславацкай рэспублікі.

З ЖЫЦЦЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. НА ЗДЫМКУ: гармата з закрытай пазіцыі вядзе агонь па «праціўніку».

Фото Захарава (СФ).

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР

САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ВАРАШЫЛАЎЦАЎ

На станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава (Менск) разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва рабочых, служачых і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала на дастойную сустрэчу XXI-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Распрацаваны самаабавязацельствы, якімі прадугледжваецца выкананне заводам гадавога плана да 12 снежня 1938 года—гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет СССР; 10-месячнага плана да 20 кастрычніка, выпрацоўка на 300 тыс. рублёў прадукцыі звыш плана і т. д.

Стаханаўцы і ўсе рабочыя кацельнага і загатоўчага цэхаў абавязаліся да XXI-й гадавіны Вялікага Кастрычніка поўнасцю выканаць гадавы план. Рабочыя гэтага цэха і брыгада радыяльна-свідравальных станкоў зборачнага цэха ўзялі на сябе самаабавязацельства—ператварыць цэх і брыгаду ў суцэльна стаханаўскія.

Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі завода зараз праводзіцца вялікая работа па выпуску новай канструкцыі радыяльна-свідравальнага станка РС-3.

Інжынерна-тэхнічныя работнікі завода абавязаліся да вялікага свята—XXI-й гадавіны Кастрычніка—спраектаваць новы вертыкальна-свідравальны станок і выпусціць адзін такі вопытны станок. Таксама праводзіцца падрыхтоўка да выпуску вопытнага аднакалоннага радыяльна-стругальнага станка СТ-3 з мадэрнізіраванай каробкай хуткасцей, каробкай падач і рэдуктарам.

Самаабавязацельствамі прадугледжваецца таксама выпуск звыш плана на 25 тысяч рублёў прадукцыі шырокага спажывання.

Па прыкладу знатнага стаханаўца Аляксандра Сямёнавіча Івашка зараз на заводзе арганізоўваецца шэфства старых кадравікоў-стаханаўцаў над маладымі рабочымі. Лепшаму цэху і брыгадзе будзе прысвоена імя XXI-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Сёння самаабавязацельствы завода будуць шырока абгавораны рабочымі па ўсіх цэхах.

І. ДАБРАВІЦКІ, І. БЛЮМКІНА.

СОЦСПАБОРНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Перадавыя прадпрыемствы Гомеля—абуткова-я фабрыка «Праца», фабрыка «Палесдрук», якія атрымалі за паспяховую работу пераходныя сцягі, як перадавыя прадпрыемствы абутковай і паліграфічнай прамысловасці БССР, звярнуліся з пісьмом да ўсіх прадпрыемстваў Гомельскай вобласці аб разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, калектыў рабочых, служачых і ІТР абутковай фабрыкі «Праца» абавязаўся: за лік эканоміі сыравіны выпусціць звыш плана 15 тысяч пар высокаякаснага абутку і ўзняць прадукцыйнасць працы звыш плана на 5 проц.

Калектыў рабочых, служачых і ІТР фабрыкі «Палесдрук» абавязаўся да 15 кастрычніка выканаць 10-месячную праграму і да 6 снежня—гадавы план.

Для паспяховага разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва абодва калектывы прапануюць:

Арганізаваць сістэматычную праверку выканання дагавораў на соцыялістычнае спаборніцтва па кожнаму гораду, раёну і прадпрыемству, шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва паміж рабочымі аднародных прафесій.

Арганізаваць сістэматычны абмен вопытам, дакладна вывучаць і пашыраць стаханаўскія метады працы сярод усяго калектыва кожнага прадпрыемства.

Н. ГІРШЫН.

ПРЫЗЫЎ У РСЧА І ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ

Сваіх лепшых людзей — маладых патрыётаў, стаханаўцаў і ўдарнікаў—пасылаюць прадпрыемствы Менска ў рады Чырвонай Арміі.

За 5 дзён прызыўную камісію Варашылаўскага раёна Менска прайшлі прызыўнікі трамвайнага парка, завода імя Молатава, друкарні імя Сталіна, хлебазавода і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

Больш 97 процантаў прызыўнікаў, прайшоўшых за 5 дзён камісію, прызнаны годнымі для страявой службы ў РСЧА. З вялікай радасцю і ўдзячнасцю атрымлівае моладзь прызначэнні ў Чырвоную Армію.

Комсамольцы-стаханаўцы Гольдшмідт і Бразгун з трамвайнага парка, комсамолец-стаханавец Пігулеўскі з друкарні імя Сталіна, столяр Супрановіч з завода імя Молатава прызначаны камісіяй у бронетанкавыя часці РСЧА.

Вялікая цяга моладзі ў авіяцыю. Вучлёты—столяр завода імя Молатава Еўдасеў, стаханавец друкарні імя Сталіна Вараб'ёў, майстар хлебазавода Юрцэвіч і іншыя прызыўнай камісіяй накіраваны ў лётныя часці.

У прызыўную камісію паступіла многа заяў прызыўнікаў і іх бацькоў аб адмаўленні ад прадастаўленых ім ільгот.

Прызыўнік Нікалай Шалковіч — рабочы друкарні імя Сталіна — мае права на ільготу па старасці сваіх бацькоў. Яго бацька — 63-гадовы Пётр Фёдаравіч — у сваёй заяве на імя старшыні прызыўнай камісіі піша:

«Я пасылаю свайго сына Нікалая ў рады РСЧА з вялікай ахвотай і радасцю. Аб службе ў Чырвонай Арміі сын мой марыў даўно. Прашу камісію накіраваць яго ў рады доблеснай Чырвонай Арміі. Ён будзе надзейна абараняць сваю шчаслівую соцыялістычную радзіму». Просьба тав. Шалковіча задаволена. Яго сын накіраван у часці сувязі.

ГІСТОРЫЯ
Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). **КАРОТКІ КУРС.** *Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год.*

УВОДЗІНЫ.

Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў) прайшла доўгі і слаўны шлях ад першых маленькіх марксісцкіх гурткоў і груп, якія паявіліся ў Расіі ў 80-х годах мінулага стагоддзя, да вялікай партыі большэвікоў, якая кіруе цяпер першай у свеце сацыялістычнай дзяржавай рабочых і сялян.

ВКП(б) вырасла на аснове рабочага руху ў дарэволюцыйнай Расіі з марксісцкіх гурткоў і груп, якія звязаліся з рабочым рухам і ўнеслі ў яго сацыялістычнае сазнанне. ВКП(б) кіравалася і кіруецца рэволюцыйным вучэннем марксізма-ленінізма. Яе правадыры ў новых умовах эпохі імперыялізма, імперыялістычных войн і пролетарскіх рэволюцый развілі далей вучэнне Маркса і Энгельса, падняялі яго на новую ступень.

ВКП(б) расла і мацнела ў прынцыповай барацьбе з дробнабуржуазнымі партыямі ўнутры рабочага руху — эсэрамі (а яшчэ раней з іх папярэднікамі — народнікамі), меншавікамі, анархістамі, буржуазнымі нацыяналістамі ўсіх масцей, а ўнутры партыі — з меншавіцкімі, апартуністычнымі плынямі, — трацкістамі, бухарынцамі, нацыянал-ухілістамі і іншымі антыленінскімі групамі.

ВКП(б) мацнела і гартавалася ў рэволюцыйнай барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа, з усімі ворагамі прапоўных — памешчыкамі, капіталістамі, кулакамі, шкоднікамі, шпіёнамі, з усімі наймітамі капіталістычнага акружэння.

Гісторыя ВКП(б) ёсць гісторыя трох рэволюцый: буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1905 года, буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў лютым 1917 года і сацыялістычнай рэволюцыі ў кастрычніку 1917 года.

Гісторыя ВКП(б) ёсць гісторыя звяржэння царызма, звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў, гісторыя разгрому чужаземнай узброенай інтэрвенцыі ў часе грамадзянскай вайны, гісторыя збудавання Совецкай дзяржавы і сацыялістычнага грамадства ў нашай краіне.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) абагачае вопытам барацьбы рабочых і сялян нашай краіны за сацыялізм.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б), вывучэнне гісторыі барацьбы нашай партыі з усімі ворагамі марксізма-ленінізма, з усімі ворагамі працоўных дапамагае **авалодваць большэвізмам**, павышае палітычную пільнасць.

Вывучэнне гераічнай гісторыі большэвіцкай партыі ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, веданнем рухаючых сіл рэволюцыі.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) умацоўвае ўпэўненасць у канчатковай перамозе вялікай справы партыі Леніна—Сталіна, перамозе комунізма ва ўсім свеце.

Кніга гэта коратка выкладае гісторыю Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў).

РАЗДЗЕЛ І
БАРАЦЬБА ЗА СТВАРЭННЕ СОЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ Ў РАСІІ.
(1883—1901 ГОДЫ).

1. АДМЕНА ПРЫГОННАГА ПРАВА І РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАГА КАПІТАЛІЗМА Ў РАСІІ. ПАЯЎЛЕННЕ СУЧАСНАГА ПРАМЫСЛОВАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА. ПЕРШЫЯ КРОКІ РАБОЧАГА РУХУ.

Царская Расія пазней іншых краін уступіла на шлях капіталістычнага развіцця. Да 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў Расіі было вельмі мала фабрык і заводаў. Пераважала прыгонніцкая гаспадарка дваран-памешчыкаў. Пры прыгонным ладзе не магла пасапраўднаму развівацца прамысловасць. Падняявольная прыгонная праца давала нізкую прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы. Увесь ход эканамічнага развіцця штурхаў к знішчэнню прыгоннага права. Царскі ўрад, аслаблены ваенным паражэннем у часе Крымскай кампаніі і запалоханы сялянскімі «бунтамі» супроць памешчыкаў, аказаўся вымушаным адмяніць у 1861 годзе прыгоннае права.

Але і пасля адмены прыгоннага права памешчыкі прадаўжалі прыгнятаць сялян. Памешчыкі аграбілі сялян, адабраўшы, адрэзаўшы ў іх пры «вызваленні» значную частку зямлі, якой сяляне карысталіся раней. Гэту частку зямлі сяляне сталі называць «адрэзкамі». Сялян прымусілі плаціць памешчыкам выкуп за сваё «вызваленне» —каля двух мільярдаў рублёў.

Пасля адмены прыгоннага права сяляне вымушаны былі на самых цяжкіх умовах арандаваць памешчыцкую зямлю. Апрача грашовай платы за аренду памешчык нярэдка прымушаў сялян дарма апрацоўваць сялянскімі прыладамі і коньмі пэўную колькасць памешчыцкай зямлі. Гэта называлася «адработкамі», «барщчынай». Часцей за ўсё селянін вымушан быў плаціць памешчыку за арэнду зямлі натурай з ураджаю ў размеры палавіны свайго ўраджаю. Гэта называлася работай «ісполу».

Такім чынам, аставалася амаль тое-ж становішча, што і пры прыгонным праве, з тою толькі рознicай, што цяпер селянін быў асабіста свабодны, яго нельга было прадаць ці купіць, як раней.

Памешчыкі выціскалі апошнія сокі з адсталай сялянскай гаспадаркі рознымі грабежніцкімі спосабамі (арэнда, штрафы). Асноўная маса сялянства з-за гнёту памешчыкаў не магла паляпшаць сваю гаспадарку. Адсюль крайняя адсталасць сельскай гаспадаркі ў дарэволюцыйнай Расіі, прыводзіўшая да частых неўраджаяў і галадовак.

Астаткі прыгонніцкай гаспадаркі, вялізныя падаці і выкупныя плацяжы памешчыкам, якія нярэдка перавышалі даходнасць сялянскай гаспадаркі, выклікалі разарэнне, абнішчанне сялянскіх мас, прымушалі сялян пакідаць вёскі ў пошуках заработку. Яны ішлі на фабрыкі і заводы. Фабрыканты атрымлівалі дзяшовую рабочую сілу.

Над рабочымі і сялянамі стаяла цэлая армія іспраўнікаў, ураднікаў, жандармаў, паліцэйскіх, стражнікаў, якія абаранялі цара, капіталістаў, памешчыкаў супроць працоўных, супроць эксплаатуемых. Да 1903 года існавалі цялесныя пакаранні. Не гледзячы на адмену прыгоннага права, сялян білі розгамі за малейшую правіннасць, за няўплату падаткаў. Рабочых збівалі паліцыя і казакі, асабліва ў часе стачак, калі рабочыя спынялі работу, не вытрымаўшы ўціску фабрыкантаў. Рабочыя і сяляне не мелі ніякіх палітычных правоў у царскай Расіі. Царскае самадзяржаўе з'яўлялася злейшым ворагам народа.

Царская Расія была турмой народаў. Шматлікія нерускія народнасці царскай Расіі былі зусім бяспраўны, безупынна падвяргаліся ўсялякім прыніжэнням і знявагам. Царскі ўрад прывучаў рускае насельніцтва глядзець на карэнныя народнасці нацыянальных абласцей як на ніжэйшую расу, называў іх афіцыяльна «інародцамі», выхоўваў прэзрэнне і нянавісць да іх. Царскі ўрад свядома распальваў нацыянальную рознь, натраўляў адзін народ на другі, арганізоўваў яўрэйскія пагромы, татара-армянскую разню ў Закаўказзі.

У нацыянальных абласцях усе або амаль усе дзяржаўныя пасады займалі рускія чыноўнікі. Усе справы ва ўстановах, у судах вяліся на рускай мове. Было забаронена выдаваць газеты і кнігі на нацыянальных мовах, у школах забаранялася абучацца на роднай мове. Царскі ўрад імкнуўся задушыць усякае праяўленне нацыянальнай культуры, праводзіў палітыку гвалтоўнага «абрусення» нерускіх нацыянальнасцей. Царызм выступаў у якасці ката і мучыцеля нерускіх народаў.

Пасля адмены прыгоннага права развіццё прамысловага капіталізма ў Расіі пайшло даволі быстра, не гледзячы на астаткі прыгонніцтва, якія яшчэ затрымлівалі гэтае развіццё. За 25 год, з 1865 па 1890 год, колькасць рабочых на адных толькі буйных фабрыках, заводах і чыгунках павялічылася з 706 да 1.433 тысяч, г. зн. больш чым у два разы.

Яшчэ больш быстра пачала развівацца капіталістычная буйная прамысловасць у Расіі ў 90 гадах. К канцу 90-х гадоў колькасць рабочых на буйных фабрыках і заводах, у горнай прамысловасці, на чыгунках толькі па 50 губерніях Еўрапейскай Расіі вырасла да 2.207 тысяч, а па ўсёй Расіі — да 2.792 тысяч.

Гэта быў сучасны прамысловы пролетарыят, які ў корані адрозніваўся ад рабочых фабрык прыгоннага перыяда і рабочых дробнай, саматужнай і ўсякай іншай прамысловасці, як сваёй згуртаванасцю на вялікіх капіталістычных прадпрыемствах, так і сваімі баявымі рэволюцыйнымі якасцямі.

Прамысловы ўздым 90-х гадоў быў звязан у першую чаргу з узмоцненым чыгуначным будаўніцтвам. За дзесяцігоддзе (1890 — 1900 годы) было пабудавана звыш 21 тысячы вёрст новых чыгуначных шляхоў. Чыгункам патрэбавалася велізарная колькасць метала (на рэльсы, паравозы, вагоны), патрабавалася ўсё больш апалу каменнага вугалю і нафты. Гэта прывяло да развіцця металургіі і апалавай прамысловасці.

Як і ва ўсіх капіталістычных краінах, у дарэволюцыйнай Расіі гады прамысловага ўздыму змяняліся гадамі прамысловых крызісаў, застою прамысловасці, якія цяжка ўдаралі па рабочаму класу, асуджалі сотні тысяч рабочых на беспрацоўе і галечу.

Хаця развіццё капіталізма пасля адмены прыгоннага права ішло ў Расіі даволі быстра, усё-ж Расія вельмі адставала ў сваім эканамічным развіцці ад іншых капіталістычных краін. Велізарная большасць насельніцтва была яшчэ занята сельскай гаспадаркай. У сваёй выдатнай кнізе «Развіццё капіталізма ў Расіі» Ленін прыводзіў важныя лічбы ўсеагульнага перапісу насельніцтва, які праводзіўся ў 1897 годзе. Аказалася, што ў сельскай гаспадарцы было занята каля пяці шостых усяго насельніцтва, у буйнай-жа і дробнай прамысловасці, гандлі, на чыгуначным і водным транспарце, на будаўніцтве, на лясных распрацоўках і так далей было занята ўсяго толькі каля адной шостай часткі насельніцтва.

Гэта паказвае, што Расія, не гледзячы на развіццё ў ёй капіталізма, была краінай аграрнай, адсталай у эканамічных адносінах, краінай дробнабуржуазнай, г. зн. такой, у якой пераважала яшчэ дробнаўласніцкая, малапрадукцыйная аднаасобная сялянская гаспадарка.

Развіццё капіталізма ішло не толькі ў горадзе, але і на вёсцы. Сялянства, самы шматлікі клас дарэволюцыйнай Расіі, распадалася, расслойвалася. На вёсцы з найбольш заможных сялян выдзялялася кулацкая вярхушка, вясковая буржуазія, а з другога боку, многія сяляне разараліся, паявлічваліся колькасць сялянскай беднаты, вясковых пролетарыяў і поўпролетарыяў. Колькасць-жа сярэдніх сялян з кожным годам змяншалася.

У 1903 годзе ў Расіі налічвалася каля 10 мільёнаў сялянскіх двароў. У сваёй брашуры «Да вясковай беднаты» Ленін падлічыў, што з гэтай колькасці двароў не менш трох з палавінай мільёнаў двароў было сялян, якія **не мелі коней**. Гэтыя бяднейшыя сялянскія двары засявалі звычайна нязначны кавалачак зямлі, астатнюю-ж зямлю здавалі кулакам, а самі ішлі на заработкі. Па свайму становішчу бяднейшыя сяляне былі бліжэй чым хто да пролетарыята. Ленін называў іх вясковымі пролетарыямі або поўпролетарыямі.

З другога боку, паўтара мільёна багатых, кулацкіх сялянскіх двароў (з усяго ліку 10 мільёнаў) забралі ў свае рукі палавіну ўсіх сялянскіх пасеваў. Гэта сялянская буржуазія багацела, прыгнятаючы беднату і сярэдняе сялянства, нажываючыся на працы батракоў і падзёншчыкаў і ператвараючыся ў сельскагаспадарчых капіталістаў.

Ужо ў 70-х і асабліва 80-х гадах мінулага стагоддзя рабочы клас у Расіі пачаў прабуджацца і павёў барацьбу з капіталістамі. Становішча рабочых у царскай Расіі было надзвычайна цяжкае. У 80-х годах рабочы дзень на фабрыках і заводах быў не менш 12½ гадзін, а ў тэкстыльнай прамысловасці даходзіў да 14—15 гадзін. Шырока ўжывалася эксплаатацыя жаночай і дзіцячай працы. Дзеці працавалі столькі-ж гадзін, колькі і дарослыя, але атрымлівалі, таксама як і жанчыны, значна меншую заработную плату. Заработная плата была нязмерна нізкая. Большая частка рабочых атрымлівала 7—8 рублёў у месяц. Самыя высокааплачваемыя рабочыя на металаапрацоўчых і ліцейных заводах атрымлівалі не больш 35 рублёў у месяц. Не было ніякай аховы працы, што прыводзіла да масавых калецтваў і смерці рабочых. Не было страхавання рабочых, медыцынская дапамога аказвалася толькі за плату. Надзвычайна цяжкія былі жыллёвыя ўмовы. У маленькіх «каморках», у рабочых казармах жылі па 10—12 чалавек рабочых. Фабрыканты часта аблічвалі рабочых, прымушалі купляць у гаспадарскіх крамах прадукты ўтрыдорага, грабілі рабочых пры дапамозе штрафаў.

Рабочыя пачалі згаварвацца паміж сабой і супольна прад'яўляць гаспадару фабрыкі, завода патрабаванні аб паляпшэнні свайго нязноснага становішча. Яны кідалі работу, г. зн. аб'яўлялі стачку, забастоўку. Першыя забастоўкі ў 70-х і 80-х годах звычайна ўзнікалі з-за нязмерных штрафаў, надувацельства, абману пры расплаце з рабочымі, збаўкі расцэнак.

Выведзеныя з цярплівасці рабочыя ў часе першых забастовак падчас ламалі машыны, білі шыбы ў фабрычных памяшканнях, грамілі гаспадарскія крамы і канторы.

Перадавыя рабочыя пачалі разумець, што для паспяховай барацьбы з капіталістамі патрэбна арганізацыя. Сталі паяўляцца рабочыя саюзы.

У 1875 годзе ў Одэсе арганізаваўся «Паўднёварасійскі саюз рабочых». Гэта першая рабочая арганізацыя праіснавала 8—9 месяцаў, затым была разгромлена царскім урадам.

У Пецербургу ў 1878 годзе арганізаваўся «Паўночны саюз рускіх рабочых», на чале якога стаялі сталяр Халтурын і слесар Обнорскі. У праграме гэтага саюза было сказана, што па сваіх задачах ён прымыкае да соцыял-дэмакратычных рабочых партый Захада. Канчатковай мэтай саюза ставілася правядзенне соцыялістычнай рэволюцыі — «ніспраўдзяжэнне існуючага палітычнага і эканамічнага ладу дзяржавы, як ладу крайне несправядлівага». Адзін з арганізатараў саюза — Обнорскі жыў пекаторы час за граніцай, пазнаёміўся там з дзейнасцю марксісцкіх соцыял-дэмакратычных партый і І Інтэрнацыянала, кіруемага Марксам. Гэта наклала свой адбітак на праграму «Паўночнага саюза рускіх рабочых». Сваёй бліжэйшай задачай гэты саюз ставіў заваяванне палітычнай свабоды і палітычных правоў для народа (свабоды слова, друку, права сходаў і так далей). У ліку бліжэйшых патрабаванняў было таксама абмежаванне рабочага дня.

Лік членаў саюза дасягаў 200 чалавек, і столькі-ж было спачуваючых. Саюз пачынаў прымаць удзел у рабочых стачках, кіраваў імі. Царскі ўрад разграміў і гэты рабочы саюз.

Але рабочы рух прадаўжаў расці, ахапляючы ўсё новыя і новыя раёны. 80-я годы даюць вялікую колькасць стачак. За пяцігоддзе (1881—1886 годы) было больш 48 стачак з 80 тысячамі бастуючых рабочых.

Асабліва вялікае значэнне ў гісторыі рэволюцыйнага руху мела вялікая стачка, успыхнуўшая ў 1885 годзе на фабрыцы Марозава ў Орэхава-Зуеве.

На гэтай фабрыцы працавала каля 8 тысяч рабочых. Умовы работы з кожным днём пагоршваліся: з 1882 па 1884 год заработная плата збаўлялася пяць разоў, прычым у 1884 годзе расцэнкі былі адразу паніжаны на адну чвэрць, г. зн. на 25 процантаў. Але апрача таго фабрыкант Марозаў замучыў рабочых штрафамі. Як выяснілася на судзе пасля стачкі, з кожнага заробленага рубля пад відам штрафаў у рабочага адымалася ў карысць фабрыканта ад 30 да 50 капеек. Рабочыя не вытрымалі гэтага грабяжу і ў студзені 1885 года аб'явілі стачку. Стачка была загадзя арганізавана. Кіраваў ёю перадавы рабочы Пётр Маісеенка, які быў раней членам «Паўночнага саюза рускіх рабочых» і меў ужо рэволюцыйны вопыт. Напярэдадні стачкі Маісеенка разам з іншымі найбольш свядомымі ткачамі выпрацаваў рад патрабаванняў да фабрыканта, якія былі зацверджаны на тайнай нарадзе рабочых. Перш за ўсё рабочыя патрабавалі спынення грабежніцкіх штрафаў.

Гэта стачка была падаўлена ўзброенай сілай. Больш 600 рабочых было арыштавана, некалькі дзесяткаў з іх было аддана пад суд.

Падобныя-ж стачкі адбываліся ў 1885 годзе на фабрыках у Іванава-Вазнясенску.

У наступным годзе царскі ўрад, напалоханы ростам рабочага руху, аказаўся вымушаным выдаць закон аб штрафах. У гэтым законе гаварылася, што штрафныя грошы павінны ісці не ў кішэню фабрыканта, а на патрэбы саміх рабочых.

На вопыце марозаўскай і іншых стачак рабочыя зразумелі, што яны многага могуць дабіцца арганізаванай барацьбой. Рабочы рух пачаў выдзяляць з свайго асяроддзя здольных кіраўнікоў і арганізатараў, цвёрда адстойваўшых інтарэсы рабочага класа.

У той-жа час на глебе росту рабочага руху і пад уплывам заходнееўрапейскага рабочага руху пачынаюць стварацца ў Расіі першыя марксісцкія арганізацыі.

2. НАРОДНІЦТВА І МАРКСІЗМ У РАСІІ. ПЛЕХАНАЎ І ЯГО ГРУПА „ВЫЗВАЛЕННЕ ПРАЦЫ". БАРАЦЬБА ПЛЕХАНАВА З НАРОДНІЦТВАМ. ПАШЫРЭННЕ МАРКСІЗМА Ў РАСІІ.

Да паяўлення марксісцкіх груп рэволюцыйную работу ў Расіі вялі народнікі, якія з'яўляліся праціўнікамі марксізма.

Першая руская марксісцкая група паявілася ў 1883 годзе. Гэта была група «Вызваленне працы», арганізаваная Г. В. Плеханавым за граніцай, у Жэневе, куды ён вымушан быў паехаць ад праследванняў царскага ўрада за рэволюцыйную дзейнасць.

Плеханаў сам быў перад гэтым народнікам. Пазнаёміўшыся ў эміграцыі з марксізмам, ён парваў з народніцтвам і стаў выдаючымся прапагандыстам марксізма.

Група «Вызваленне працы» прарабіла вялікую работу па пашырэнню марксізма ў Расіі. Яна пераклала на рускую мову работы Маркса і Энгельса: «Маніфест комуністычнай партыі», «Наёмная праца і капітал», «Развіццё соцыялізма ад утопіі да навукі» і іншыя, надрукавала іх за граніцай і пачала тайна распаўсюджваць у Расіі. Г. В. Плеханаў, Засуліч, Аксельрод і іншыя ўдзельнікі гэтай групы напісалі таксама рад твораў, у якіх яны раз'яснялі вучэнне Маркса і Энгельса, раз'яснялі ідэі **навуковага соцыялізма**.

Маркс і Энгельс, вялікія настаўнікі пролетарыята, у процівагу соцыялістам-утапістам, першыя растлумачылі, што соцыялізм — не выдумка мячтацеляў (утапістаў), а неабходны рэзультат развіцця сучаснага капіталістычнага грамадства. Яны паказалі, што капіталістычны лад падзе таксама, як паў прыгонны лад, што капіталізм сам стварае сабе магільшчыка ў асобе пролетарыята. Яны паказалі, што толькі класавая барацьба пролетарыята, толькі перамога пролетарыята над буржуазіяй вызваліць чалавецтва ад капіталізма, ад эксплаатацыі.

Маркс і Энгельс вучылі пролетарыят усведамляць свае сілы, усведамляць свае класавыя інтарэсы і аб'ядноўваць для рашучай барацьбы з буржуазіяй. Маркс і Энгельс адкрылі законы развіцця капіталістычнага грамадства і навукова даказалі, што развіццё капіталістычнага грамадства і класавая барацьба ў ім павінны неміну ча прывесці да падзення капіталізма, да перамогі пролетарыята, да **дыктатуры пролетарыята**.

Маркс і Энгельс вучылі, што вызваліцца ад улады капітала і ператварыць капіталістычную ўласнасць ва ўласнасць грамадскую немагчыма мірным шляхам, што дабіцца гэтага рабочы клас можа толькі шляхам прымянення рэволюцыйнага насілля супроць буржуазіі, шляхам **пролетарскай рэволюцыі**, шляхам устанаўлення свайго палітычнага панавання — дыктатуры пролетарыята, якая павінна падавіць супраціўленне эксплаататараў і стварыць новае, бяскласавае комуністычнае грамадства.

Маркс і Энгельс вучылі, што прамысловы пролетарыят з'яўляецца самым рэволюцыйным і таму — самым перадавым класам капіталістычнага грамадства, што толькі такі клас, як пролетарыят, можа сабрать вакол сябе ўсе нездаволеныя капіталізмам сілы і павесці іх на штурм капіталізма. Але каб перамагчы стары свет і стварыць новае бяскласавае грамадства, пролетарыят павінен мець сваю ўласную рабочую партыю, якую Маркс і Энгельс называлі комуністычнай партыяй.

Пашырэннем поглядаў Маркса і Энгельса і занялася першая руская марксісцкая група, плеханаўская група «Вызваленне працы».

Група «Вызваленне працы» падняла сцяг марксізма ў рускім замежным друку ў той момант, калі соцыял-дэмакратычнага руху ў Расіі яшчэ не было. Неабходна было перш за ўсё тэарэтычна, ідэйна пракласці шлях гэтаму руху. Галоўнай ідэйнай перашкодай на шляху пашырэння марксізма і соцыял-дэмакратычнага руху ў той час былі народніцкія погляды, якія пераважалі тады сярод перадавых рабочых і рэволюцыйна настроенай інтэлігенцыі.

З развіццём капіталізма ў Расіі рабочы клас станавіўся магутнай перадавой сілай, здольнай да арганізаванай рэволюцыйнай барацьбы. Але перадавой ролі рабочага класа не разумелі народнікі. Рускія народнікі памылкова лічылі, што галоўнай рэволюцыйнай сілай з'яўляецца не рабочы клас, а сялянства, што ўладу цара і памешчыкаў можна звергнуць шляхам адных толькі сялянскіх «бунтаў». Народнікі не ведалі рабочы клас і не разумелі, што без саюза з рабочым класам і без яго кіраўніцтва адны сяляне не змогуць перамагчы царызм і памешчыкаў. Народнікі не разумелі, што рабочы клас з'яўляецца самым рэволюцыйным і самым перадавым класам грамадства.

Народнікі спачатку прабавалі падняць сялян на барацьбу супроць царскага ўрада. З гэтай мэтай рэволюцыйная інтэлігентная моладзь, пераапрануўшыся ў сялянскую вопратку, рушыла ў вёску — «у народ», як тады гаварылі. Адсюль і пайшла назва «народнікі». Але за імі сялянства не пайшло, бо яны і сялян, як след, не ведалі і не разумелі. Большасць народнікаў была арыштавана паліцыяй. Тады народнікі рашылі прадаўжаць барацьбу супроць царскага самадзяржаўя аднымі сваімі сіламі, без народа, што прывяло да яшчэ больш сур'ёзных памылак.

Народніцкае тайнае таварыства «Народная воля» пачало рыхтаваць забойства цара. 1 сакавіка 1881 года народавольцам удалося кінутай бомбай забіць цара Аляксандра II. Аднак, гэта не прынесла ніякай карысці народу. Забойствамі асобных людзей нельга было звергнуць царскае самадзяржаўе, нельга было знішчыць клас памешчыкаў. На месца забітага цара паявіўся другі — Аляксандр III, пры якім рабочым і сялянам стала жыць яшчэ горш.

Выбраны народнікамі шлях барацьбы з царызмам праз асобныя забойствы, праз індывідуальны тэрор быў памылковым і шкодным для рэволюцыі. Палітыка індывідуальнага тэрору выходзіла з няправільнай народніцкай тэорыі актыўных «герояў» і пасіўнага «натоўпу», чакаючага ад «герояў» подвігу. Гэтая ілжывая тэорыя гаварыла, што толькі асобныя выдаючыяся адзіночкі робяць гісторыю, а маса, народ, клас, «натоўп», як пагардліва выражаліся народніцкія пісьменнікі, нездольна да свядомых, арганізаваных дзеянняў, яна можа толькі слепа ісці за «героямі». Таму народнікі адмовіліся ад масавай рэволюцыйнай работы сярод сялянства і рабочага класа і перайшлі да індывідуальнага тэрору. Народнікі прымусілі аднаго з буйнейшых рэволюцыянераў таго часу Сцяпана Халтурына спыніць работу па арганізацыі рэволюцыйнага рабочага саюза і цалкам заняцца тэрорам.

Народнікі адцягвалі ўвагу працоўных ад барацьбы з класам прыгнятальнікаў бескарыснымі для рэволюцыі забойствамі асобных прадстаўнікоў гэтага класа. Яны тармазілі развіццё рэволюцыйнай ініцыятывы і актыўнасці рабочага класа і сялянства.

Народнікі перашкаджалі рабочаму класу зразумець яго кіруючую ролю ў рэволюцыі і затрымлівалі стварэнне самастойнай партыі рабочага класа.

Хоць тайная арганізацыя народнікаў была разбіта царскім урадам, народніцкія погляды доўга яшчэ трымаліся сярод рэволюцыйна настроенай інтэлігенцыі. Астаткі народнікаў упорна супраціўляліся пашырэнню марксізма ў Расіі, перашкаджалі арганізацыі рабочага класа.

Таму марксізм у Расіі мог вырасці і ўзмацнець толькі ў барацьбе з народніцтвам.

Група «Вызваленне працы» разгарнула барацьбу супроць памылковых поглядаў народнікаў, паказвала, якую шкоду прыносіць рабочаму руху вучэнне народнікаў і іх спосабы барацьбы.

У сваіх работах, накіраваных супроць народнікаў, Плеханаў паказаў, што погляды народнікаў нічога агульнага не маюць з навуковым соцыялізмам, хоць народнікі і называлі сябе соцыялістамі.

Плеханаў першы даў марксісцкую крытыку памылковых поглядаў народнікаў. Наносячы меткія ўдары народніцкім поглядам, Плеханаў адначасова разгарнуў бліскучую абарону марксісцкіх поглядаў.

У чым заключаліся асноўныя памылковыя погляды народнікаў, якім Плеханаў нанёс сакрушальны ўдар?

Па-першае, народнікі сцвярджалі, што капіталізм у Расіі прадстаўляе «выпадковую» з'яву, што ён не будзе развівацца ў Расіі, значыцца не будзе расці і развівацца і пролетарыят.

Па-другое, народнікі не лічылі рабочы клас перадавым класам у рэволюцыі. Яны марылі аб дасягненні соцыялізма без пролетарыята. Галоўнай рэволюцыйнай сілай народнікі лічылі сялянства, кіруемае інтэлігенцыяй, і сялянскую абшчыну, якую яны разглядалі, як зародак і аснову соцыялізма.

Па-трэцяе, у народнікаў быў памылковы і шкодны погляд на ўвесь ход гісторыі чалавецтва. Яны не ведалі і не разумелі законаў эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства. Яны былі ў гэтых адносінах зусім адсталымі людзьмі. Па іх думцы, гісторыю робяць не класы і не барацьба класаў, а толькі асобныя выдаючыяся людзі—«героі», за якімі слепа ідуць масы, «натоўп», народ, класы.

Змагаючыся супроць народнікаў і выкрываючы іх, Плеханаў напісаў рад марксісцкіх работ, на якіх вучыліся і выхоўваліся марксісты ў Расіі. Такія работы Плеханава, як «Соцыялізм і палітычная барацьба», «Нашы рознагалоссі», «Да пытання аб развіцці маністычнага погляду на гісторыю», расчысцілі глебу для перамогі марксізма ў Расіі.

У сваіх работах Плеханаў выклаў асноўныя пытанні марксізма. Асабліва важнае значэнне мела яго кніга «Да пытання аб развіцці маністычнага погляду на гісторыю», выданая ў 1895 годзе. Ленін указваў, што на гэтай кнізе «выхавалася цэлае пакаленне рускіх марксістаў» (**Ленін**, т. XIV, стар. 347).

У сваіх работах, накіраваных супроць народнікаў, Плеханаў даказаў, што недарэчна ставіць пытанне так, як ставілі яго народнікі: павінен ці не павінен развівацца капіталізм у Расіі? Справа ў тым, гаварыў Плеханаў, даказваючы гэта фактамі, што Расія **ўжо ўступіла** на шлях капіталістычнага развіцця і што няма такой сілы, якая магла-б яе з гэтага шляху звярнуць.

Задача рэволюцыянераў была не ў тым, каб **затрымаць** развіццё капіталізма ў Расіі, — гэтага яны ўсёроўна не змаглі-б зрабіць. Задача рэволюцыянераў заключалася ў тым, каб абаперціся на тую магутную рэволюцыйную сілу, якая нараджаецца развіццём капіталізма, — на рабочы клас, развіваць яго класавае сазнанне, арганізаваць яго, дапамагчы яму стварыць сваю рабочую партыю.

Плеханаў разбіў і другі асноўны памылковы погляд народнікаў — адмаўленне імі перадавой ролі пролетарыята ў рэволюцыйнай барацьбе. Народнікі разглядалі паяўленне пролетарыята ў Расіі як свайго роду «гістарычнае няшчасце», пісалі аб «язве пролетарыяцтва». Плеханаў, абараняючы вучэнне марксізма і яго поўную прымянімасць да Расіі, даказваў, што, не гледзячы на колькасную перавагу сялянства і параўнальную малалікасць пролетарыята, — іменна на пролетарыят, на яго рост павінны рэволюцыянеры ўскласці свае галоўныя надзеі.

Чаму іменна на пролетарыят?

Таму, што пролетарыят, не гледзячы на яго пяперашнюю малалікасць, з'яўляецца такім працоўным класам, які звязан з **найбольш перадавой** формай гаспадаркі, — з буйнай вытворчасцю, і мае ў сувязі з гэтым вялікую будучыню.

Таму, што пролетарыят, як клас, **расце** з года ў год, **развіваецца** палітычна, лёгка паддаецца арганізацыі ў сілу ўмоў працы на буйнай вытворчасці і найбольш рэволюцыйны ў сілу свайго пролетарскага становішча, бо ў рэволюцыі яму няма чаго трацiць, апрача сваіх ланцугоў.

Інакш абстаіць справа з сялянствам. Сялянства (гутарка ішла аб аднаасобным сялянстве.—**Рэд.**), не, гледзячы на яго шматлікасць, з'яўляецца такім працоўным класам, які звязан з **найбольш адсталай** формай гаспадаркі,—

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.).

ПРАЦЯГ.

дробнай вытворчасню, з прычыны чаго яно не мае і не можа мець вялікай будучыні.

Сялянства не толькі не расце, як клас, а, наадварот, **распадаецца** з года ў год на буржуазію (кулакі) і беднату (пролетарыі, поўпролетарыі). К таму-ж яно больш цяжка паддаецца арганізацыі ў сілу сваёй распыленасці і менш ахвотна ідзе ў рэволюцыйны рух у сілу свайго дробна-ўласніцкага становішча, чым пролетарыят.

Народнікі сцвярджалі, што ў Расіі соцыялізм прыйдзе не праз дыктатуру пролетарыята, а праз сялянскую абшчыну, якую яны лічылі зародкам і базай соцыялізма. Але абшчына не была і не магла быць ні базай, ні зародкам соцыялізма, бо ў абшчыне панавалі кулакі, «міраеды», якія эксплаатавалі беднякоў, батракоў, маламоцных сераднякоў. Фармальна існаваўшае абшчынное землеўладанне і перадзелы зямлі па едаках, якія адбываліся час ад часу, ніколькі не мянялі справы. Зямлёй карысталіся тыя члены абшчыны, у якіх былі рабочая жывёла, інвентар, насенне, гэта значыць заможныя сераднякі і кулакі. Сяляне, якія не мелі коней, беднякі і наогул маламоцныя вымушаны былі аддаваць зямлю кулакам і ісці ў наймёты, у батракі. Сялянская абшчына была на самай справе зручнай формай для прыкрыцця кулацкага засілля і даяшовым сродкам у руках царызма для збору падаткаў з сялян па прынцыпу кругавой парукі. Таму царызм не чапаў сялянскую абшчыну. Смешна было-б лічыць такую абшчыну зародкам ці базай соцыялізма.

Плеханаў разбіў таксама трэці асноўны памылковы погляд народнікаў наконт першаступеннай ролі ў грамадскім развіцці «герояў», выдаючыхся асоб, іх ідэй, і наконт нікчэмнай ролі масы, «натоўпу», народа, класаў. Плеханаў абвінавачваў народнікаў у **ідэалізме**, даказваючы, што праўда не на баку ідэалізма, а на баку **матэрыялізма** Маркса—Энгельса.

Плеханаў развіў і абгрунтаваў пункт гледжання марсісцкага матэрыялізма. Згодна марксісцкага матэрыялізма, ён даказваў, што развіццё грамадства вызначаецца ў канчатковым выніку не пажаданнямі і ідэямі выдаючыхся асоб, а развіццём матэрыяльных умоў існавання грамадства, зменамі спосабаў вытворчасці матэрыяльных даброт, неабходных для існавання грамадства, зменамі ўзаемаадносін класаў у галіне вытворчасці матэрыяльных даброт, барацьбой класаў за ролю і месца ў галіне вытворчасці і размеркавання матэрыяльных даброт. Не ідэі вызначаюць грамадска-эканамічнае становішча людзей, а грамадска-эканамічнае становішча людзей вызначае іх ідэі. Выдаючыяся асобы могуць ператварыцца ў нішто, калі іх ідэі і пажаданні ідуць уразрэз з эканамічным развіццём грамадства, уразрэз з патрэбнасцямі перадавога класа, і—наадварот—выдаючыяся людзі могуць стаць сапраўды выдаючымісяі асобамі, калі іх ідэі і пажаданні правільна выражаюць патрэбнасці эканамічнага развіцця грамадства, патрэбнасці перадавога класа.

На сцвярджэнні народнікаў аб тым, што маса ёсць натоўп, што толькі героі робяць гісторыю і ператвараюць натоўп у народ, марксісты адказвалі: не героі робяць гісторыю, а гісторыя робіць герояў, значыцца, — не героі ствараюць народ, а народ стварае герояў і рухае наперад гісторыю. Героі, выдаючыяся асобы могуць адыгрываць сур'ёзную ролю ў жыцці грамадства толькі пастолькі, паколькі яны змогуць правільна зразумець умовы развіцця грамадства, зразумець, — як іх змяніць да лепшага. Героі, выдаючыяся асобы могуць папасці ў становішча смешных і нікому непатрэбных няўдачнікаў, калі яны не змогуць правільна зразумець умоў развіцця грамадства і пачнуць перціся супроць гістарычных патрэбнасцей грамадства, уабражаючы сябе «дзелацелямі» гісторыі.

Да разралу такіх імённа герояў-няўдачнікаў і належалі народнікі.

Літаратурныя творы Плеханава, яго барацьба з народнікамі грунтоўна падарвалі ўплыў народнікаў сярод рэволюцыйнай інтэлігенцыі. Але ідэйны разгром народніцтва далёка яшчэ не быў завяршон. Гэта задача — дабіць народніцтва, як ворага марксізма — выпала на долю Леніна.

Большасць народнікаў хутка пасля разгрому партыі «Народнай волі» адмовілася ад рэволюцыйнай барацьбы з царскім уралам, пачала прапаведваць прымірэнне, пагалненне з царскім урадам. Народнікі ў 80-х і 90-х годах сталі выражальнікамі інтарэсаў кулацтва.

Група «Вызваленне працы» склала два праекты праграмы рускіх соцыял-дэмакратаў (першы ў 1884 г. і другі ў 1887 г.). Гэта быў вельмі важны крок для падрыхтоўкі стварэння марксісцкай соцыял-дэмакратычнай партыі ў Расіі.

Але ў групы «Вызваленне працы» былі і сур'ёзныя памылкі. У яе першым праекце праграмы былі яшчэ астаткі народніцкіх поглядаў, папускалася тактыка індывідуальнага тэрору. Плеханаў не ўлічваў, далей, што ў ходзе рэволюцыі пролетарыят можа і павінен павесці за сабой сялянства, што толькі ў саюзе з сялянствам пролетарыят зможа атрымаць перамогу над царызмам. Плеханаў разглядаў, далей, ліберальную буржуазію, як сілу, якая можа аказаць палтрыманне рэволюцыі, хоць і нетрывалае падтрыманне, сялянства-ж у некаторых сваіх работах ён зусім скідаў з рахунку, заяўляючы, напрыклад, што:

«Апрача буржуазіі і пролетарыята мы не бачым іншых грамадскіх сіл, на якія маглі-б у нас апірацца апазіцыйныя ці рэволюцыйныя камбінацыі» (**Плеханаў**, т. III, стар. 119).

Гэтыя памылковыя погляды Плеханава былі зародкам яго будучых меншавіцкіх поглядаў.

І група «Вызваленне працы» і марксісцкія гурткі таго часу, не былі яшчэ звязаны практычна з рабочым рухам. Гэта быў яшчэ перыяд узнікнення і ўмацавання ў Расіі тэорыі марксізма, ідэй марксізма, праграмных палажэнняў соцыял-дэмакратыі. Соцыял-дэмакратыя за дзесяцігоддзе 1884—1894 гадоў існавала яшчэ ў выглядзе асобных невялікіх груп і гурткоў, не звязаных ці вельмі мала звязаных з масавым рабочым рухам. Падобна яшчэ ненарадзіўшамуся, але ўжо развіваючамуся ва ўтробе маці дзіцяці, соцыял-дэмакратыя перажывала, як пісаў Ленін, **«працэс утробнага развіцця»**.

Група «Вызвалення працы» «толькі тэарэтычна аснавала соцыял-дэмакратыю і зрабіла першы крок насустрач рабочаму руху», — указваў Ленін.

Задачу злучэння марксізма з рабочым рухам у Расіі, а таксама выпраўлення памылак групы «Вызваленне працы» прышлося вырашыць Леніну.

У той-жа час народнікі ў сваіх журналах вялі цкаванне марксістаў. Свядома скажаючы, зусім пераблытваючы погляды рускіх марксістаў, народнікі запэўнялі, быццам марксісты хочуць разарэння вёскі, быццам марксісты хочуць «выварыць кожнага мужыка ў фабрычным катле». Выкрываючы гэтую фальшывую народніцкую крытыку, Ленін паказаў, што справа не ў «жаданнях» марксістаў, а ў сапраўдным ходзе развіцця капіталізма ў Расіі, пры якім колькасць пролетарыята немінуча павялічваецца. Але пролетарыят з'явіцца магільшчыкам капіталістычнага ладу.

Ленін паказаў, што сапраўднымі прыяцелямі народа, якія жадаюць знішчыць капіталістычны і памешчыцкі гнёт, знішчыць царызм, з'яўляюцца не народнікі, а марксісты.

Ленін у сваёй кнізе «Што такое прыяцелі народа» ўпершыню высунуў ідэю рэволюцыйнага саюза рабочых і сялян, як галоўнага сродку звяржэння царызма, памешчыкаў, буржуазіі.

Ленін у радзе сваіх работ гэтага перыяду падвяргаў крытыцы тыя сродкі палітычнай барацьбы народнікаў, якімі карысталася асноўная група народнікаў — народавольцы, а пазней — прадаўжальнікі народнікаў — эсэры, у асаблівасці тактыку індывідуальнага тэрору. Ленін лічыў яе шкоднай для рэволюцыйнага руху, бо яна паменшвала барацьбу мас барацьбой адзіночак-герояў. Яна азначала нявер'е ў народны рэволюцыйны рух.

У кнізе «Што такое прыяцелі народа» Ленін намячаў асноўныя задачы рускіх марксістаў. Па думцы Леніна, рускія марксісты павінны былі ў першую чаргу арганізаваць з разрозненых марксісцкіх гурткоў адзіную соцыялістычную рабочую партыю. Ленін указваў далей, што імённа рабочы клас Расіі ў саюзе з сялянствам зваліць царскае самадзяржаўе, пасля чаго рускі пролетарыят у саюзе з прапоўнымі і эксплаатуемымі масамі, побач з пролетарыятам іншых краін, прамой дарогай адкрытай палітычнай барацьбы пойдзе да пераможнай комуністычнай рэволюцыі.

Такім чынам, больш 40 год таму назад Ленін правільна ўказаў шлях барацьбы рабочага класа, вызначыў яго ролю, як перадавой рэволюцыйнай сілы грамадства, вызначыў ролю сялянства, як саюзніка рабочага класа.

Барацьба Леніна і яго старонікаў супроць народніцтва ўжо ў 90-х годах прывяла да канчатковага ідэйнага разгрому народніцтва.

Велізарнае значэнне мела таксама барацьба Леніна супроць «легальнага марксізма». Як заўсёды бывае ў гісторыі, да вялікага грамадскага руху звычайна прымазваюцца часовыя «спадарожнікі». Такімі «спадарожнікамі» былі і так званыя **«легальныя марксісты»**. Марксізм пачаў шырока распаўсюджвацца ў Расіі. І вось буржуазныя інтэлігенты пачалі апранацца ў марксісцкае адзенне. Яны друкавалі свае артыкулы ў легальных, гэта значыць дазволеных царскім урадам, газетах і журналах. Таму іх і пачалі называць «легальнымі марксістамі».

Яны па-свойму вялі барацьбу з народніцтвам. Але гэтую барацьбу і сцяг марксізма яны прабавалі скарыстаць для таго, каб рабочы рух падпарадкаваць і прыстасаваць да інтарэсаў буржуазнага грамадства, да інтарэсаў буржуазіі. З вучэння Маркса яны выкідалі самае галоўнае — вучэнне аб пролетарскай рэволюцыі, аб дыктатуры пролетарыята. Віднейшы легальны марксіст Пётр Струве ўсхваляў буржуазію і замест рэволюцыйнай барацьбы супроць капіталізма, — заклікаў «прызнаць нашу некультурнасць і пайсці на вывучку да капіталізма».

У барацьбе супроць народнікаў Ленін лічыў дапушчальным часовае пагадненне з «легальнымі марксістамі», каб скарыстаць іх супроць народнікаў, напрыклад, сумесны выпуск друкаванага зборніка супроць народнікаў. Але ў той-жа час Ленін з усёй рэзкасцю крытыкаваў «легальных марксістаў», выкрываючы іх ліберальна-буржуазнае нутро.

Многія з гэтых «спадарожнікаў» сталі потым кадэтамі (галоўная партыя рускай буржуазіі), а ў час грамадзянскай вайны — заядлымі белагвардзейцамі.

Побач з «Саюзамі барацьбы» ў Пецербургу, Маскве, Кіеве і т. д. паявіліся соцыял-дэмакратычныя арганізацыі таксама на заходніх нацыянальных ускраінах Расіі. У 90-х годах вылучыліся марксісцкія элементы з польскай нацыяналістычнай партыі і ўтварылі «Соцыял-дэмакратыю Польшчы і Літвы». У канцы 90-х гадоў ствараюцца арганізацыі латвійскай соцыял-дэмакратыі. У кастрычніку 1897 года ў заходніх губерніях Расіі створан быў Усеагульны яўрэйскі соцыял-дэмакратычны саюз — Бунд.

У 1898 годзе некалькі «Саюзаў барацьбы», пецербургскі, маскоўскі, кіеўскі, екацерынаслаўскі і Бунд зрабілі першую спробу аб'яднацца ў соцыял-дэмакратычную партыю. З гэтай мэтай яны сабраліся на І з'езд Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) у сакавіку 1898 года ў Менску.

На І з'ездзе РСДРП было ўсяго 9 удзельнікаў. Леніна не было на з'ездзе, бо ён знаходзіўся ў гэты час у ссылцы ў Сібіры. Цэнтральны Камітэт партыі, выбраны на з'ездзе, быў у хуткім часе арыштован. «Маніфест», выпушчаны ад імя з'езда, быў яшчэ ў многім нездавальняючым. У ім была абыйдзена задача заваявання пролетарыятам палітычнай улады, нічога не сказана аб гегемоніі пролетарыята, абыйдзена пытанне аб саюзніках пролетарыята ў яго барацьбе супроць царызма і буржуазіі.

З'езд у сваіх рашэннях і ў «Маніфесце» абвясціў стварэнне Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

У гэтым фармальным акце, які адыграў вялікую рэволюцыйна-прапагандысцкую ролю, заключалася значэнне І з'езда РСДРП.

Аднак, не гледзячы на адбыўшыйся І з'езд, на справе марксісцкая соцыял-дэмакратычная партыя ў Расіі не была яшчэ створана. З'езду не ўдалося асобныя марксісцкія гурткі і арганізацыі аб'яднаць і звязаць арганізацыйна. Не было яшчэ адзінай лініі ў рабоце мясцовых арганізацый, не было праграмы партыі, статута партыі, не было кіраўніцтва з аднаго цэнтра.

З гэтай прычыны і ў сёму раду іншых прычын ідэйны разброд у мясцовых арганізацыях стаў павялічвацца, а гэтая акалічнасць стварыла спрыяючыя ўмовы для ўзмацнення ў рабочым руху апартуністычнай плыні — «эканамізма».

Спатрэбілася некалькі год напружанай работы Леніна і арганізаванай ім газеты «Искра», каб пераадолець разброд, перамагчы апартуністычныя хістанні і падрыхтаваць утварэнне Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

3. ПАЧАТАК РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЛЕНІНА. ПЕЦЕРБУРГСКІ „САЮЗ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ РАБОЧАГА КЛАСА".

Уладзімір Ільіч Ленін, аснавальнік большэвізма, нарадзіўся ў г. Сімбірску (цяпер Ульянаўск) у 1870 годзе. У 1887 годзе Ленін паступіў у Казанскі універсітэт, але хутка быў арыштован і выключан з універсітэта за ўдзел у рэволюцыйным руху студэнтаў. У Казані Ленін уступіў у марксісцкі гурток, арганізаваны Федасеевым. Пасля пераезду Леніна ў Самару вакол яго быстра ўтварыўся першы гурток самарскіх марксістаў. Ужо тады Ленін здзіўляў усіх сваім веданнем марксізма.

У канцы 1893 года Ленін пераехаў у Пецербург. Першыя-ж выступленні Леніна зрабілі моцнае ўражанне на ўдзельнікаў пецербургскіх марксісцкіх гурткоў. Надзвычай глыбокае веданне Маркса, уменне прымяняць марксізм да эканамічнай і палітычнай абстаноўкі Расіі таго часу, гарачая, несакрушальная вера ў перамогу рабочай справы, выдатны арганізацыйны талент — усё гэта зрабіла Леніна прызнаным кіраўніком пецербургскіх марксістаў.

Ленін карыстаўся гарачай любоўю перадавых рабочых, з якімі ён займаўся ў гуртках.

«Нашы лекцыі, — успамінаў рабочы Бабушкін аб занятках Леніна ў рабочых гуртках, — насілі характар вельмі жывы, цікавы, мы ўсе бывалі вельмі задаволены гэтымі лекцыямі і пастаянна захапляліся розумам нашага лектара».

У 1895 годзе Ленін аб'яднаў у Пецербургу ўсе марксісцкія рабочыя гурткі (іх было ўжо каля 20) у адзін «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Гэтым ён падрыхтаваў стварэнне рэволюцыйнай марксісцкай рабочай партыі.

Ленін ставіў перад «Саюзам барацьбы» задачу звязацца цясней з масавым рабочым рухам і палітычна кіраваць ім. Ад **прапаганды** марксізма сярод невялікай колькасці перадавых рабочых, сабраных у прапагандысцкіх гуртках, Ленін прапанаваў перайсці да злобадзённай палітычнай **агітацыі** сярод шырокіх мас рабочага класа. Гэты паварот у бок масавай агітацыі меў сур'ёзнае значэнне для далейшага развіцця рабочага руху ў Расіі.

У 90-х годах прамысловасць перажывала перыяд уздыму. Расла колькасць рабочых. Узмацніўся рабочы рух. З 1895 па 1899 год баставала, па няпоўных даных, не менш 221 тысячы рабочых. Рабочы рух ператвараўся ў сур'ёзную сілу палітычнага жыцця краіны. Самім жыццём пацвярджаліся погляды марксістаў, якія яны абараняілі ў барацьбе з народнікамі, наконт перадавой ролі рабочага класа ў рэволюцыйным руху.

Пад кіраўніцтвам Леніна «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» звязваў барацьбу рабочых за эканамічныя патрабаванні — за паляпшэнне ўмоў працы, за скарачэнне рабочага дня, за павышэнне заработнай платы — з палітычнай барацьбой супроць царызма. «Саюз барацьбы» выхоўваў рабочых палітычна.

Пад кіраўніцтвам Леніна пецербургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» ўпершыню ў Расіі стаў ажыццяўляць **злучэнне соцыялізма з рабочым рухам.** Калі ўзнікала стачка на якой-небудзь фабрыцы, «Саюз барацьбы», які добра ведаў праз удзельнікаў сваіх гурткоў становішча на прадпрыемствах, неадкладна адклікаўся выпускам лістовак, выпускам соцыялістычных пракламацый. У гэтых лістоўках выкрываліся прыпясненні рабочых фабрыкантамі, растлумачвалася, як трэба змагацца рабочым за свае інтарэсы, змяшчаліся патрабаванні рабочых. Лістоўкі гаварылі ўсю праўду аб язвах капіталізма, аб жабрацкім жыцці рабочых, аб іх нязмерна цяжкай 12—14-гадзіннай працы, аб іх бяспраўным становішчы. Тут-жа прад'яўлялісяі адпаведныя палітычныя патрабаванні. У канцы 1894 года Ленін пры ўдзеле рабочага Бабушкіна напісаў першую такую агітацыйную лістоўку і зварот да забаставаўшых рабочых Семянікоўскага завода ў Пецербургу. Восенню 1895 года Ленін напісаў лістоўку да бастуючых рабочых і работніц фабрыкі Тарнтона. Гэтая фабрыка належала англійскім фабрыкантам, якія атрымлівалі мільённыя прыбыткі. Рабочы дзень тут прадаўжаўся больш 14 гадзін, а зараблялі ткачы каля 7 рублёў у месяц. Забастоўка скончылася паспяхова для рабочых. За кароткі час «Саюзам барацьбы» былі надрукаваны дзесяткі такіх лістовак, зваротаў да рабочых розных фабрык. Кожны такі лісток моцна падымаў дух рабочых. Рабочыя бачылі, што ім дапамагаюць, іх абараняюць соцыялісты.

Пад кіраўніцтвам «Саюза барацьбы» праходзіла забастоўка 30 тысяч пецербургскіх тэкстыльных рабочых летам 1896 года. Асноўным патрабаваннем было скарачэнне рабочага дня. Пад напорам гэтай забастоўкі царскі ўрад вымушан быў выдаць закон ад 2 чэрвеня 1897 года, які абмяжоўваў рабочы дзень да $11^1/_2$ гадзін. Да гэтага закона рабочы дзень не быў наогул абмяжован.

У снежні 1895 года Ленін быў арыштован царскім урадам. Ленін і ў турме не спыняў рэволюцыйнай барацьбы. Ён дапамагаў «Саюзу барацьбы» сваімі парадамі і ўказаннямі, перасылаючы з турмы брашуры і лістоўкі. У турме Леніным былі напісаны брашура «Абстачках» і лістоўка «Царскаму ўраду», у якой выкрывалася дзікае свавольства царскага ўрада. У турме-ж Ленін напісаў праект праграмы партыі (ён быў напісан малаком паміж радкоў медыцынскай кнігі).

Пецербургскі «Саюз барацьбы» даў магутны штуршок да аб'яднання рабочых гурткоў у такія-ж саюзы і ў іншых гарадах і абласцях Расіі. У сярэдзіне 90-х гадоў узнікаюць марксісцкія арганізацыі ў Закаўказзі. У 1894 годзе ўтвараецца ў Маскве маскоўскі «Рабочы саюз». У Сібіры ў канцы 90-х гадоў арганізаваўся сібірскі «Соцыял-дэмакратычны саюз». У 90-х годах у Іванава-Вазнесенску, Яраслаўлі, Кастраме ўзніклі марксісцкія групы, якія аб'ядналіся потым у «Паўночны саюз соцыял-дэмакратычнай партыі». У Растове-на-Дану, Екацерынаславе, Кіеве, Нікалаеве, Туле, Самары, Казані, Орэхава-Зуеве і ў іншых гарадах ствараюцца ў другой палавіне 90-х гадоў соцыял-дэмакратычныя групы і саюзы.

Значэнне пецербургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» заключалася ў тым, што ён, па выражэнню Леніна, прадстаўляў першы сур'ёзны **зачатак рэволюцыйнай партыі, апіраючайся на рабочы рух.**

На рэволюцыйны вопыт пецербургскага «Саюза барацьбы» апіраўся Ленін у сваёй далейшай рабоце па стварэнню марксісцкай соцыял-дэмакратычнай партыі ў Расіі.

Пасля арышту Леніна і яго бліжэйшых саратнікаў састаў кіраўніцтва пецербургскага «Саюза барацьбы» значна змяніўся. Паявіліся новыя людзі, якія называлі сябе «маладымі», а Леніна і яго саратнікаў — «старымі». Яны пачалі весці памылковую палітычную лінію. Яны заяўлялі, што трэба заклікаць рабочых толькі да эканамічнай барацьбы супроць гаспадароў, што-ж датычыць палітычнай барацьбы, то гэта — справа ліберальнай буржуазіі, якой павінна належаць кіраўніцтва палітычнай барацьбой.

Такіх людзей сталі называць «эканамістамі».

Гэта была першая згодніцкая, апартуністычная група ў радах марксісцкіх арганізацый у Расіі.

4. БАРАЦЬБА ЛЕНІНА СУПРОЦЬ НАРОДНІЦТВА І „ЛЕГАЛЬНАГА МАРКСІЗМА". ЛЕНІНСКАЯ ІДЭЯ САЮЗА РАБОЧАГА КЛАСА І СЯЛЯНСТВА. І З'ЕЗД РАСІЙСКАЙ СОЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ.

Хоць Плеханаў ужо ў 80-х гадах нанёс асноўны ўдар народніцкай сістэме поглядаў, аднак у пачатку 90-х гадоў погляды народнікаў усё яшчэ сустракалі спачуванне сярод некаторай часткі рэволюцыйнай моладзі. Частка моладзі прадаўжала думаць, што Расія можа мінуць капіталістычны шлях развіцця, што галоўную ролю ў рэволюцыі будзе адыгрываць сялянства, а не рабочы клас. Астаткі народнікаў усяляк імкнуліся перашкодзіць пашырэнню марксізма ў Расіі, павялі барацьбу супроць марксістаў, стараючыся іх усяляк апарочыць. Трэба было да канца ідэйна **разграміць** народніцтва, каб забяспечыць далейшае пашырэнне марксізма і магчымасць стварэння соцыял-дэмакратычнай партыі.

Гэтая работа была прароблена Леніным.

У сваёй кнізе «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў?» (1894 год) Ленін да канца выкрыў сапраўдны твар народнікаў, як фальшывых «прыяцеляў народа», якія ідуць на справе супроць народа.

Народнікі 90-х гадоў па сутнасці даўно адмовіліся ад усякай рэволюцыйнай барацьбы з царскім урадам. Ліберальныя народнікі прапаведвалі прымірэнне з царскім урадам. «Яны проста думаюць, — пісаў Ленін пра народнікаў таго часу, — што калі папрасіць больш хораша ды ласкавей у гэтага ўрада, то ён можа ўсё добра ўладзіць» (**Ленін**, т. 1, стар. 161).

Народнікі 90-х гадоў закрывалі вочы на становішча беднаты на вёсцы, на класавую барацьбу на вёсцы, на эксплуатацыю беднаты кулацтвам і ўсхвалялі развіццё кулацкіх гаспадарак. Яны выступалі па сутнасці справы як выражальнікі інтарэсаў кулацтва.

5. БАРАЦЬБА ЛЕНІНА З „ЭКАНАМІЗМАМ". ПАЯЎЛЕННЕ ЛЕНІНСКАЙ ГАЗЕТЫ „ИСКРА".

На І з'ездзе РСДРП Леніна не было. Ён знаходзіўся ў гэты час у ссылцы ў Сібіры, у сяле Шушэнскім, куды яго загнаў царскі ўрад пасля доўгага прабывання ў пецербургскай турме па справе «Саюза барацьбы».

Але і ў ссылцы Ленін прадаўжаў рэволюцыйную работу. У ссылцы Ленін закончыў важнейшую навуковую работу «Развіццё капіталізма ў Расіі», якая завяршыла ідэйны разгром народніцтва. Там-жа ён напісаў вядомую брашуру «Задачы рускіх соцыял-дэмакратаў».

Не гледзячы на тое, што Ленін быў адарван ад непасрэднай рэволюцыйна-практычнай работы, ён усё-ж змог захаваць некаторыя сувязі з практыкамі, вёў з імі перапіску з ссылкі, рабіў запытанні, даваў ім парады. Леніна асабліва цікавіла ў гэты час пытанне аб «эканамістах». Ён разумеў лепш, чым хто-небудзь іншы, што «эканамізм» ёсць асноўная ячэйка згодніцтва, апартунізма, што перамога «эканамізма» ў рабочым руху будзе азначаць падрыў рэволюцыйнага руху пролетарыята, паражэнне марксізма.

І Ленін пачаў граміць «эканамістаў» з першых-жа дзён іх паяўлення.

«Эканамісты» сцвярджалі, што рабочыя павінны весці толькі эканамічную барацьбу, што-ж датычыць палітычнай барацьбы, то яе няхай вядзе ліберальная буржуазія, якую павінны падтрымліваць рабочыя. Ленін лічыў падобную прапаведзь «эканамістаў» адступніцтвам ад марксізма, адмаўленнем неабходнасці самастойнай палітычнай партыі для рабочага класа, спробай — ператварыць рабочы клас у палітычны прыдатак буржуазіі.

У 1899 годзе група «эканамістаў» (Пракаповіч, Кускова і іншыя, якія сталі потым кадэтамі) выпусціла свой маніфест. Яны выступілі супроць рэволюцыйнага марксізма і патрабавалі адмовы ад стварэння самастойнай палітычнай партыі пролетарыята, адмовы ад самастойных палітычных патрабаванняў рабочага класа. «Эканамісты» лічылі, што палітычная барацьба — справа ліберальнай буржуазіі, што датычыць рабочых, то з іх дастаткова і эканамічнай барацьбы з гаспадарамі.

Азнаёміўшыся з гэтым апартуністычным дакументам, Ленін склікаў нараду палітычных ссыльных-марксістаў, якія знаходзіліся паблізу, і 17 таварышаў на чале з Леніным вынеслі рэзкі выкрывальны пратэст супроць поглядаў «эканамістаў».

Гэты пратэст, напісаны Леніным, быў распаўсюджан у марксісцкіх арганізацыях па ўсёй Расіі і меў велізарнае значэнне ў справе развіцця марксісцкай мыслі і марксісцкай партыі ў Расіі.

Рускія «эканамісты» прапаведвалі тыя-ж погляды, што і пращўнікі марксізма ў замежных соцыял-дэмакратычных партыях, так званыя бернштэініянцы, г. н. старонікі апартуніста Бернштэйна.

Таму барацьба Леніна супроць «эканамістаў» была ў той-жа час барацьбой супроць міжнароднага апартунізма.

Асноўную барацьбу супроць «эканамізма», за стварэнне самастойнай палітычнай партыі пролетарыята правяла арганізаваная Леніным нелегальная газета «Искра».

У пачатку 1900 года Ленін і іншыя члены «Саюза барацьбы» вярнуліся з сібірскай ссылкі ў Расію. Ленін задумаў стварыць вялікую агульнарускую нелегальную марксісцкую газету. Мноства дробных марксісцкіх гурткоў і арганізацый, якія існавалі ўжо ў Расіі, не былі яшчэ звязаны паміж сабою. У гэты момант, калі, па выражэнню тав. Сталіна, «саматужніцтва і гурткоўшчына раз'ядалі партыю зверху данізу, калі ідэйны разброд складаў характэрную рысу ўнутранага жыцця партыі», стварэнне агульнарускай нелегальнай газеты з'яўлялася асноўнай задачай рускіх рэволюцыйных марксістаў. Толькі такая газета магла звязаць паміж сабой разрозненыя марксісцкія арганізацыі і падрыхтаваць стварэнне сапраўднай партыі.

Але такую газету немагчыма было арганізаваць у царскай Расіі з-за паліцэйскіх праследванняў. Праз месяц—два газета была-б выследжана царскімі сышчыкамі і разгромлена. Таму Ленін рашыў выдаваць яе за граніцай. Тут газета друкавалася на самай тонкай і трывалай паперы і тайна перасылалася ў Расію. Асобныя нумары «Искры» перадрукоўваліся ў Расіі, у тайных друкарнях у Баку, у Кішынёве, у Сібіры.

Восенню 1900 года Владзімір Ільіч паехаў за граніцу, каб згаварыцца з таварышамі з групы «Вызваленне працы» адносна выдання агульнарускай палітычнай газеты. Гэта мысль была абдумана Леніным у ссылцы ва ўсіх падрабязнасцях. Па дарозе з ссылкі Ленін правёў па гэтаму пытанню рад нарад ва Уфе, Пскове, Маскве, Пецербургу. Усюды ён умаўляўся з таварышамі аб шыфрах для тайнай перапіскі, аб адрасах для прысылкі літаратуры і т. д. І абмяркоўваў з імі план будучай барацьбы.

Царскі ўрад адчуваў, што ў асобе Леніна ён мае надзвычай небяспечнага ворага. У сваёй тайнай перапісцы царскі ахраннік, жандарм Зубатаў, пісаў, што «буйнейшага за Ульянава ў рэволюцыі зараз нікога няма», з прычыны чаго ён лічыў мэтазгодным арганізаваць забойства Леніна.

Па прыездзе за граніцу Ленін згаварыўся з групай «Вызваленне працы», гэта значыць з Плеханавым, Аксельродам, В. Засуліч, аб сумесным выданні «Искры». Увесь план выдання быў распрацован Леніным ад пачатку да канца.

У снежні 1900 года за граніцай выйшаў першы нумар газеты «Искра». Пад загалоўкам газеты было выслоўе (эпіграф): **«З іскры разгарыцца полымя».** Гэтыя словы ўзяты з адказу дзекабрыстаў паэту Пушкіну, які паслаў ім прывітанне ў сібірскую ссылку.

І сапраўды, з запаленай Леніным «Искры» разгарэлася ў далейшым полымя вялікага рэволюцыйнага пажару, якое спаліла ўшчэнт дваранска-памешчыцкую царскую манархію і буржуазную ўладу.

КАРОТКІЯ ВЫВАДЫ.

Марксісцкая соцыял-дэмакратычная рабочая партыя ў Расіі стваралася ў барацьбе ў першую чаргу з народніцтвам, з яго памылковымі і шкоднымі для справы рэволюцыі поглядамі.

Толькі разбіўшы ідэйна погляды народнікаў, можна было расчысціць глебу для стварэння марксісцкай рабочай партыі ў Расіі. Рашаючы ўдар народніцтву быў нанесен у 80-х годах мінулага стагоддзя Плеханавым і яго групай «Вызваленне працы».

Ленін у 90-х годах завяршыў ідэйны разгром народніцтва, дабіў народніцтва.

Група «Вызваленне працы», аснаваная ў 1883 годзе, прарабіла вялікую работу па пашырэнню марксізма ў Расіі, тэарэтычна аснавала соцыял-дэмакратыю і зрабіла першы крок насустрач рабочаму руху.

З развіццём капіталізма ў Расіі быстра расла колькасная прамысловага пролетарыята. У палавіне 80-х гадоў рабочы клас уступіў на шлях арганізаванай барацьбы, на шлях масавых выступленняў у выглядзе арганізаваных стачак. Але марксісцкія гурткі і групы займаліся толькі прапагандай, не разумелі мэтазгоднасці пераходу на масавую агітацыю ў рабочым класе і, таму, не былі яшчэ практычна звязаны з рабочым рухам, не кіравалі ім.

Утварэнне Леніным пецербургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» (1895 год), які павёў масавую агітацыю сярод рабочых і кіраваў масавымі стачкамі, азначала новы этап — пераход на масавую агітацыю сярод рабочых і злучэнне марксізма з рабочым рухам. Пецербургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» з'явіўся першым зачаткам рэволюцыйнай пролетарскай партыі ў Расіі. Услед за пецербургскім «Саюзам барацьбы» стварыліся арганізацыі марксістаў ва ўсіх галоўных прамысловых цэнтрах, таксама як і на акраінах.

У 1898 годзе была ажыццёўлена першая, хоць і не ўдаўшаяся спроба аб'яднання марксісцкіх соцыял-дэмакратычных арганізацый у партыю — адбыўся І з'езд РСДРП. Але гэты з'езд яшчэ не стварыў партыю: не было ні праграмы, ні статута партыі, ні кіраўніцтва з аднаго цэнтра, не было амаль ніякай сувязі паміж асобнымі марксісцкімі гурткамі і групамі.

Каб аб'яднаць і звязаць паміж сабой разрозненыя марксісцкія арганізацыі ў адну партыю, Ленін высунуў і ажыццявіў план стварэння першай агульнарускай газеты рэволюцыйных марксістаў — «Искры».

Галоўнымі працўнікамі стварэння адзінай палітычнай рабочай партыі былі ў гэты перыяд «эканамісты». Яны адмаўлялі неабходнасць такой партыі. Яны падтрымлівалі разрозненасць і саматужніцтва асобных груп. Імённа супроць іх і накіравалі свае ўдары Ленін і арганізаваная ім «Искра».

Выпуск першых нумароў «Искры» (1900—1901 годы) з'явіўся пераходам да новага перыяду — перыяду сапраўднага ўтварэння з разрозненых груп і гурткоў адзінай Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

ЗВОДКА

АБ ХОДЗЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ У КАЛГАСАХ ПА АБЛАСЦЯХ БССР НА 10 ВЕРАСНЯ 1938 г. (у проц. да плана).

Вобласці	Паселна азімых	У тым ліку сартавых	Паднята заблёва	Закладзена сілосу	Абмалочана азімых і яравых каласавых, уключаючы ўборку камбайнамі.	Разаслана ільну	Паднята са сцеліўчаў ільну	Узлушчана старні	Выкапана бульбы.
Віцебская	76,4	70,3	4,4	28,5	49,8	89,9	0,8	3,4	2,3
Гомельская	62,0	34,0	9,5	30,2	58,9	99,2	6,5	41,3	3,9
Магілеўская	73,3	50,4	8,9	16,3	47,8	94,6	3,9	8,1	1,5
Менская	78,4	72,2	15,4	20,7	41,3	91,7	2,2	18,3	2,5
Палеская	72,9	47,8	21,0	45,8	48,8	98,5	17,7	131,0	2,3
Па БССР	73,4	59,4	10,2	26,1	48,4	92,8	3,4	20,1	2,0
Было на 31/VIII—38 г.	21,9	19,5	7,4	19,1	39,1	81,3	1,1	17,6	1,3

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НАРКАМЗЕМА БССР.

ЗМЯНШАЮЦЬ КОШТ ПРАЦАДНЯ

Сёлета калгасы сабралі высокі ўраджай і атрымалі велізарныя грашовыя прыбыткі. Хутка наступіць радасны дзень, калі гэтыя багацці, здабытыя рукамі калгаснікаў, будуць размеркаваны на працадні.

Прыбыткі патрэбна размеркаваць, строга прытрымліваючыся сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі. У пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах запісана: «Статут сельскагаспадарчай арцелі патрабуе, каб праўленні калгасаў расходвалі сродкі толькі ў тых размерах і па тых артыкулах, якія прадугледжаны зацверджаным агульным сходам калгаснікаў каштарысам».

Наперакор гэтым указанням партыі і ўрада ў калгасах Церахоўскага раёна груба парушаюцца каштарысы ў адносінах выдаткавання грашовых сродкаў. Так, напрыклад, у калгасе «Пяскі», Глыбоцкага сельсовета, за першае паўгоддзе гэтага года расходвана на адміністрацыйна-гаспадарчыя патрэбы 6823 руб., тады, калі на год каштарысам прадугледжана расходваць усяго 500 рублёў.

Парушаючы статут сельскагаспадарчай арцелі, старшыня праўлення тав. Караленка і рахункавод тав. Каўтуноў, дапусцілі, што 15 чалавек калгасных коннюхаў акрамя працадзён у дадатак яшчэ атрымліваюць па 200 рублёў грашыма і цэнтнеру жытняй мукі кожны.

Наогул у гэтым калгасе ўчот і кантроль пастаўлены з рук вон дрэнна. Куды гэта варта, калі на працягу 5—6 месяцаў за падсправаздачнымі асобамі лічыцца па некалькі сот рублёў грошай. Шофер Нікалай Чырун мае пад справаздачай 278 руб., былы загадчык МТФ Нікалай Агеенка — 350 рублёў і т. д.

Няправільнае скарыстанне сродкаў наглядаецца і ў іншых калгасах раёна. Старшыня сельгасарцелі «Чырвоны сцяг», Маркавіцкага сельсовета, за першыя 5 месяцаў г.г. па 21 артыкулу каштарыса (адміністрацыйна-гаспадарчыя расходы) расходваў 1224 руб., а на год каштарысам прадугледжана ўсяго 1174 руб. Перарасходаван артыкул каштарысу аб закупцы дробнага інвентару і іншыя.

На пытанне, чаму парушаецца каштарыс, рахункавод калгаса тав. Мельнікаў адказаў:

— Нам патрэбна размеркаваць на працадні 41.395 руб., а на іншыя выдаткі—20.000 руб. Будзе вельмі добра калі на працадні мы размяркуем хаця 20.000 руб., а на іншыя выдаткі скарыстаем 40.000.

У рэзультаце грашовы кошт працадня калгасніка змяншаецца ў два разы. З-за адсутнасці кантролю калгасныя сродкі разбазарваюцца направа і налева.

Рэвізійная камісія, якая павінна сачыць і кантраліраваць усю работу праўлення, бяздзейнічае. Спачатку года не зроблена ні адной рэвізіі, а патрэбна было зрабіць тры. Не дзіўна, што гэтымі днямі агульны сход калгаснікаў выказаў недавер'е рэўкамісіі і яе старшыні тав. Лапеку. Сход выбраў новую рэўкамісію.

У калгасах «Чырвоны рассвет», Падабранскага сельсовета. «Пабеда», «Чырвоная зорка», Грабаўскага сельсовета, каштарысаў зусім няма. Кіраўнікі гэтых калгасаў без ведама агульных сходаў сродкі скарыстоўваюць па свайму жаданню.

Райза нічога не зрабіў, каб наладзіць праверку, як выконваюцца прыходна-расходныя каштарысы калгасаў. Інструктар-бухгалтар райза тав. Дземідзенка прызнаецца:

— Каштарысы парушаюцца, але што я адзін зраблю? У Церахоўскай і Пролетарскай МТС павінны працаваць 4 чалавекі спецыяльна па ўчоту ў калгасах, а іх няма.

У большасці калгасаў раёна рэвізійныя камісіі не сочаць, як скарыстоўваюцца калгасныя прыбыткі, што робіцца да падрыхтоўкі размеркавання даходаў на працадні.

Трэба неадкладна спыніць незаконныя скарыстанні калгасных сродкаў Старшыні калгасаў, рахункаводы, старшыні рэўкамісій, якія, наперакор статуту сельгасарцелі і артыкулам каштарыса, дапускаюць скарыстанне даходаў калгаса не па прызначэнню, тым самым наўмысна паніжаюць кошт працадня калгаснікаў. У пастанове Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ясна сказана: «...прыцягваць да крымінальнай адказнасці асоб, віноўных у незаконным выдаткоўванні калгасных сродкаў, якія ідуць у парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі і інтарэсаў калгаснікаў, разглядаючы гэтыя дзеянні, як здраду справе калгасаў і дапамогу ворагам народа».

Р. СЯРГЕЕНКА.

НЕ ДАПУСКАЦЬ СТРАТ НА МАЛАЦЬБЕ

У соўгасе «Завалочыцы» (дырэктар тав. Дзем'яненка), Глускага раёна, у часе ўборкі ўраджаю былі дапушчаны вялікія страты ўраджаю. Праведзенай праверкай устаноўлена, што страты на кожны гектар збожжавых культур дасягаюць да 45 кілограмаў.

Цяпер у соўгасе ідзе масавая малацьба. Якасць-жа абмалоту вельмі дрэнная. У саломе азімай пшаніцы ад недавымалата астаецца 14,2 проц. зерня, у жытняй саломе — 3,1 проц.

Такія-ж страты зерня пры абмалоце наглядаюцца ў цэлым радзе іншых калгасаў і соўгасаў Палескай вобласці; яны складаюць сотні тон хлеба, які ідзе міма свірнаў калгасаў і соўгасаў.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што на палях раду калгасаў і соўгасаў вобласці засталося яшчэ нязгрэбленае калоссе, а збіранне яго не праводзіцца. Больш таго, там, дзе калоссе згрэблена, яно не звозіцца з поля і псуецца. Так, у калгасе «Социялізм», Хойніцкага раёна, страты пры ўборцы ўраджаю дасягнулі 36—38 кілограмаў зерня на гектар, а ў калгасе «11 ліпеня», Нараўлянскага раёна, страты даходзяць да 75 кілограмаў на гектар.

Н. ЖЫЛІНСКІ, аграном.

1.428 ТЭЛЕФАНІЗАВАНЫХ СЕЛЬСОВЕТАЎ

У БССР ужо тэлефанізавана 1428 сельскіх советаў. У большасці раёнаў рэспублікі праведзена суцэльная тэлефанізацыя сельсоветаў. У бягучым годзе пабудаваны новыя лініі даўжынёю ў 212 кілометраў. Тэлефанізацыя ўсіх сельсоветаў рэспублікі павінна быць завершана ў бягучым годзе. На гэтыя работы адпушчана да 1 мільёна рублёў.

З ЖЫЦЦЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. НА ЗДЫМКУ: **наменік палітрука, сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Пацянчанкаў (злева) перад выхадам на заняткі праводзіць інструкцыйную гутарку з комсоргамі.** Фото Захарава (СФ).

АБЛАСНАЯ НАРАДА СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ

ГОМЕЛЬ. **(Кар. «Звязды»).** 8 і 9 верасня ў Гомелі адбывалася абласная нарада старшынь сельсоветаў, у якой прынялі ўдзел 200 старшынь сельсоветаў, а таксама намеснікі старшынь і сакратары райвыканкомаў.

На нарадзе быў заслухан даклад старшыні оргкамітэта Вярхоўнага Совета БССР па Гомельскай вобласці — намесніка старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Мальцава аб ходзе выканання палітычна-гаспадарчых задач і чарговых задачах сельскіх советаў.

У спрэчках выступілі старшыні Баханіцкага сельсовета, Журавіцкага раёна — тав. Караленка, Бывалькаўскага сельсовета, Лоеўскага раёна — тав. Ехведаў, Сівенскага сельсовета, Веткаўскага раёна — тав. Калеснікаў і інш. Усяго выказалася 26 чалавек.

Са змястоўнай прамовай выступіў дэпутат Вярхоўнага Совета БССР начальнік абласнога ўпраўлення НКВД тав. Шліфенсон.

Удзельнікі нарады паслалі прывітальную тэлеграму любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Нарада прыняла зварот да ўсіх старшынь сельсоветаў вобласці з заклікам аб хутчэйшым і лепшым завяршэнні сельскагаспадарчага года і выкананні планаў усіх відаў загатовак.

МАЛАДЫЯ КАДРЫ СУДОВЫХ РАБОТНІКАЎ

Судовыя органы БССР умацаваны новымі маладымі кадрамі. За пяць месяцаў выпушчаны на аднаго работу ў судах 132 чалавекі. Гэтыя выпускнікі — рабочыя, нізавыя судовыя работнікі, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, выпускнікі Беларускага юрыдычнага інстытута і юрыдычнай школы. Рабочы-загатоўшчык абутковай фабрыкі «Прагрэс» комсамолец тав. Віхман выбран членам Віцебскага абласнога суда. Рабочы гомельскага паравозавагонарамонтнага завода тав. Каплінскі—член Гомельскага абласнога суда. Каваль машынабудаўнічага завода імя Кірава тав. Лерман працуе членам Гомельскага абласнога суда. 32 народныя суддзі вылучаны старшынямі, намеснікамі старшынь і членамі абласных судоў. Так, нарсуддзя Ветрынскага раёна тав. Апалька — цяпер старшыня Палескага абласнога суда. Былы нарсуддзя Копыльскага раёна тав. Віндзін—намеснік старшыні Віцебскага абласнога суда і т. д.

У Менску праведзены трохмесячныя курсы па перападрыхтоўцы нарсуддзяў. Адкрываюцца курсы па павышэнню кваліфікацыі судовых выканаўцаў і адказных сакратароў суда і пракуратуры на 60 чалавек.

ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ ЧЭМПІЯНАТ БССР

З кожным днём усё больш і больш абвастраецца барацьба ў шахматным турніры. Трэці і чацвёрты тур дазволілі, нарэшце, вызначыць лідэраў: пасля трох тураў іх было двое — Ліліенталь і Верасаў, пасля чацвертага тура — на чале турніра аказаўся адзін гросмейстар Ліліенталь, які мае тры ачкі з трох магчымых. Крайне цікавай і напружанай была яго партыя з Верасавым, у якой ён вышаў пераможцам. Марудна, але правільна рухаецца майстар Панаў: пасля нічыёй у другім туры ён мае дзве перамогі — над Івановым і Камянецкім. Няўдала іграе трэці масквіч — майстар Дуз-Хацімірскі: у трэцім туры ён адклаў партыю з Брэйтманам, у чацвертым — прайграў Сташэўскаму.

У шашачным турніры сыграна ўжо пяць тураў. На чале турніра ідзе юны першакатэгорнік Барок, які мае 3,5 ачка з 5 магчымых.

Сёння на турніры — даігрыванне адкладзеных і прапушчаных партый. Выключную цікавасць прадстаўляе партыя майстра Панава з гросмейстрам Ліліенталем. Заўтра гросмейстар Ліліенталь дае сеанс адначасовай ігры для шахматыстаў другой і трэцяй катэгорый.

ТЫПОВЫ СТАТУТ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ

Вышэйшая школа нашай краіны карыстаецца велізарнай увагаю нашай партыі, совецкага ўрада, любоўю ўсяго нашага народа. Найярчэйшым пацвярджэннем гэтага з'яўляецца зацвярджэнне Соўнаркомам СССР тыповага статута вышэйшай навучальнай установы, апублікаванага ў газеце «Известия Советов депутатов трудящихся СССР» ад 12 верасня г.г.

Тыповы статут ВНУ—дакумент вялікай палітычнай важнасці, сведчанне няўхільнага росту вышэйшай асветы ў краіне социялізма, дзе права на асвету, запісанае залатымі літарамі ў Сталінскай Канстытуцыі, ажыццяўляецца мільёнамі працоўных. Совецкая дзяржава мае шырокую сетку навучальных устаноў, з найбагацейшымі лабараторыямі, кабінетамі, клінікамі. Пераважная большасць студэнтаў забяспечана стыпендыямі. Дзяржаваю адпушчана ў бягучым годзе на гэта больш 800 мільёнаў рублёў. У 700 вышэйшых навучальных установах нашай радзімы навучаецца каля 600 тысяч студэнтаў.

У статуце адлюстраваны асноўныя задачы вышэйшай школы.

«У адпаведнасці з 121 арт. Канстытуцыі Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, вышэйшыя навучальныя ўстановы ажыццяўляюць права на асвету ўсіх грамадзян Саюза ССР і маюць сваёй мэтаю падрыхтоўку кадраў, здольных авалодаць перадавой навукай і тэхнікай, узброеных ведамі навуковага социялізма, гатовых абараняць совецкую радзіму і беззаветна адданых справе пабудовы комуністычнага грамадства» — гаворыцца ў статуце.

У статуце сказана, што правам на паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і на бясплатную асвету карыстаюцца ўсе грамадзяне СССР, маючыя атэстаты аб сканчэнні курса сярэдняй школы, незалежна ад соцыяльнага паходжання, полу, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, ва ўзросце ад 17 да 35 год. Скончыўшыя сярэднюю школу па асноўных прадметах на выдатна, прымаюцца ў ВНУ без прыймовых экзаменаў. Пераважная большасць студэнтаў забяспечваецца стыпендыямі.

Статут устанаўляе структуру кожнай вышэйшай навучальнай установы, правы і абавязкі яе кіруючых кадраў, прафесарска-выкладчыцкага састава, аспірантаў і студэнтаў.

Перавод студэнтаў з курса на курс праводзіцца адзін раз у год. Паспяховасць студэнтаў вызначаецца наступнымі адзнакамі: «выдатна», «добра», «пасрэдна», «нездавальняюча». Кожны студэнт атрымлівае адзіны студэнцкі білет і адзіны матрыкул (заліковую кніжку).

Тыя студэнты, якія выканалі вучэбны план на выдатна і добра па ўсіх прадметах і якія здалі дзяржаўныя экзамены ці абаранілі дыпломны праект на выдатна, атрымліваюць дыплом з адзнакай. Гэтыя студэнты карыстаюцца перавагаю на заняцце вакантных пасад па спецыяльнасці, на залічэнне ў аспірантуру і т. д.

Кафедра ВНУ з'яўляецца асноўнай вучэбнай арганізацыяй, якая непасрэдна ажыццяўляе вучэбна-метадычную і навукова-даследчую работу па адной ці некалькіх цесна звязаных паміж сабою дысцыплінах.

У аспірантуру ВНУ прымаюцца асобы, якія маюць закончаную вышэйшую асвету па адпаведных спецыяльнасцях і праявіўшыя здольнасць да педагагічнай і навукова-даследчай работы. Аспіранты абавязаны выканаць індывідуальны вучэбны план і абараніць дысертацыйную работу, пасля чаго ім прысвойваецца вучоная ступень кандыдата навук. Усе аспіранты забяспечваюцца дзяржаўнай стыпендыяй.

У статуце акрэсліваецца палажэнне аб грамадскіх арганізацыях ВНУ. У іх задачу ўваходзіць палітычнае выхаванне, арганізацыя соцспаборніцтва, умацаванне свядомай дысцыпліны сярод студэнтаў.

Студэнты, якія парушаюць вучэбную дысцыпліну і правілы ўнутранага распарадку, падвяргаюцца дысцыплінарным спагнанням, якія накладае дырэктар (заўвага, вымова, суровая вымова з папярэджаннем), а студэнты, якія без уважлівых прычын сістэматычна парушаюць правілы ўнутранага распарадку і не наведваюць заняткі без уважлівых прычын, а таксама робяць ганьбячыя іх учынкі, загадам дырэктара выключаюцца з ВНУ.

Задача партыйных і комсамольскіх арганізацый — растлумачыць кожнаму студэнту вялікае палітычнае і арганізацыйнае значэнне новага статута, змагаючыся за поўнае яго выкананне. Студэнты—комуністы і комсамольцы павінны быць прыкладам дакладнага выканання статута вышэйшай навучальнай установы.

СПРАВЫ РЭЧЫЦКАГА ДЗІЦЯЧАГА САНАТОРЫЯ

У Рэчыцкім раёне, на прыгожым прыродным месцы, пабудаван дзіцячы санаторый. Тут на працягу года ўмацоўвае сваё здароўе шчасліваякая дзетвара. Беларускі ўрад асаблівую ўвагу звярнуў на гэты санаторый. Тут ёсць усе магчымасці для таго, каб узорна паставіць работу па абслугоўванню прыязджаючых сюды дзяцей. Таму ад абслугоўваючага персанала, якому даручан лёс дзяцей, патрабуецца чулы, бацькоўскі падыход да падрастаючага пакалення.

Але, на вялікі жаль, некаторыя работнікі санаторыя, асабліва галоўны ўрач тав. Марозава, не зразумелі і на сённешні дзень сваёй асноўнай ролі.

Для лепшага ўмацавання здароўя дзяцей неабходзен строгі рэжым у харчаванні, адпачынку і т. д. Але гэты рэжым у санаторыі сістэматычна зрываецца.

Марозава павінна штодзённа рабіць аналіз прыгатаванай стравы для дзяцей, але, як правіла, яна чакае, каб да яе на кватэру пасылаліся некалькі пасыльных «кур'ераў», у выніку чаго дзеці замест 8 гадзін, снедаюць у 9—10 гадзін.

Так, галоўны ўрач Марозава адносіцца да сваіх прамых абавязкаў. Паводзіны Марозавай праяўляюцца не толькі ў гэтым. Яна вельмі груба адносіцца да абслугоўваючага персанала. Яна прымушае іх выконваць хатнюю работу ў сваёй кватэры, што выклікае справядлівае нараканне з боку работнікаў.

Работніцу С. яна назвала «статуй», медсястру І. неаднаразова абляяла нецэнзурнымі словамі. Такія выпадкі неадзінкавы. Крыкі, ругань, розныя мянушкі — вось стыль яе работы.

У выніку такога кіраўніцтва і адносін да абслугоўваючага персанала за апошнія 6 месяцаў пакінулі работу 4 медсястры.

Аб рабоце тав. Марозавай неаднаразова ставілася пытанне перад Наркаматам аховы здароўя, але чамусьці Наркамат аховы здароўя, як і дырэктар санаторыя тав. Левін Б., ліберальнічае ў гэтых адносінах.

Хто-ж, нарэшце, заклічэ да парадку галоўнага ўрача рэчыцкага дзіцячага санаторыя.

І. СТРАЛЬНІЦКАЯ.

ПА ГАРАДАХ І РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

★ У Чэрыкаве пры міжраённай трахаматознай больніцы пабудавана электрастанцыя, якая асвятляе ўвесь больнічны гарадок. Пры больніцы будуць абсталяваны рэнтгенаўскі кабінет і сталаводалячэбніца.

★ 53 рабочых і работніц торфзавода імя Орджанікідзе, Смалявіцкага раёна, закончылі сезонную школу па ліквідацыі непісьменнасці і атрымалі велы ў аб'ёме чатырох класаў. Лепшыя выдатнікі вучобы прэміраваны.

★ Пры Віцебскім шчоткамбінаце адкрылася стаханаўская тэхнічная школа. 50 лепшых стаханаўцаў на працягу двух год будуць павышаць у гэтай школе свой агульнаадукацыйны і тэхнічны ўзровень.

★ Добра правялі водпускі рабочыя і служачыя магілеўскай швейнай фабрыкі імя Валадарскага. 210 рабочых пабывалі ў домах адпачынку, 225—у асоавіяхімаўскіх лагерах, 10 чалавек былі накіраваны на санаторна-курортнае лячэнне.

Вып. абавязкі адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕУ.

Дзіцячы кінатэатр ДЗЯЦІНСТВА ГОРКАГА

Кіно «Спартак» ВАРОЖЫЯ СЦЕЖКІ

Кіно «Парыжская Комуна» (Цэнтр. парк культуры і адпачынку)
1. Выпадак на граніцы.
2. Гарачыя дзянёчкі.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯУ званіце па тэлефону № 25-384

Кінатэатр «Чырвоная зорка» ПРАФЕСАР МАМЛОК

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» ВОЛГА-ВОЛГА

Кінатэатр «Навіны дня»
1. Журнал Саюзкінохронікі № 40.
2. Журналы Менскай студыі кінохронікі №№ 23—24.

ГАСТРОЛІ ВІЦЕБСКАГА ВЕЛДЗЯРЖТЭАТРА (Памяшк. Велдзярждрамтэатра)

14 верасня «ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ»

Пачатак а 8 гадзін веч.
Каса адкрыта а 11.30 да 2 г. дня і а 5.30 да 9 г. веч.

Беларуская кантора „ГЛАВРЕЗИНЫ“ прыступіла да прыёму ЗАЯВАК на 1939 год на гумава-азбеставыя вырабы промтэхнікі і шырспажыву

(за выключэннем аўта і вела-пнеўматыкі і гумавага абутку).

ЗАЯЎКІ павінны быць састаўлены ПА УСТАНОЎЛЕНАЙ ФОРМЕ за атрыманнем якіх неабходна звяртацца ў Белкантору «Главрезины»—гор. Менск, Совецкая, 51.

Тэрмін прадстаўлення заявак да 25 верасня г. г. Пасля гэтага тэрміну прыём заявак спыняецца і прадпрыемствы, не падаўшыя своечасова заявак, будуць пазбаўлены магчымасці атрымання гумава-азбеставых вырабаў на ўвесь 1939 год.

БЕЛКАНТОРА «ГЛАВРЕЗИНЫ».

БЕЛАРУСКАЯ БАЗА ЛАБАРАТОРНАГА АБСТАЛЯВАННЯ і РЭАКТЫВАЎ БЕЛАПТЭКАУПРАЎЛЕННЯ

(Менск, Совецкая, 57, тэлеграфны адрас: Менск, «Лаборреактив»), абвяшчае да ведама ўсіх лабараторый, размешчаных на тэрыторыі БССР, што ёю ПРАВОДЗІЦЦА ПРЫЁМ

ЗАЯВАК НА ХІМІЧНЫЯ РЭАКТЫВЫ І ЛАБАРАТОРНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ на 1939 г. ПА НАСТУПНАЙ ФОРМЕ:

ЗАЯЎКА

НА ХІМІЧНЫЯ РЭАКТЫВЫ (або лабараторнае абсталяванне)

Назва спажыўца _____
Паштовы адрас спажыўца і № тэлефона _____
Адрас для грузаў _____
Назва банка і № разліковага рахунка _____
Наркамат і Главк, у які ўваходзіць спажывец _____

№№ па прайскуранту «Союзлаборреактив»	Назва хімічных рэактываў (або лабараторнага абсталявання)	Адзінка вымеру	Адпускная цана	Заяўлена на 1939 г. Кол.	Заяўлена на 1939 г. Сума	Выдадзена па дагавору 1939 г. Кол.	Выдадзена па дагавору 1939 г. Сума	Учот выканання дагавора							
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16

Дырэктар завода (або інстытута) (подпіс)
Заг. лабараторыяй (подпіс)
Нач. аддз. снабжэння (подпіс).

Заяўкі на лабараторнае абсталяванне і хімічныя рэактывы складаюцца раздзельна.
Форма заяўкі спажыўцом запаўняецца да 6 графы ўключна па групах тавараў у алфавітным парадку, паказаных у прайскурантах трэста «Союзлаборреактив» на 1939 г.
Заяўкі, складзеныя не па форме, прыма цца не будуць.
Заяўленая прадукцыя ацэньваецца ў адпускных цэнах, паказаных у прайскурантах трэста «Союзлаборреактив» на 1939 г.
Тэрмін падачы заявак да 5 кастрычніка 1938 г.
Прыём па пытаннях заявак штодзённа ад 10 да 2-х гадзін дня.

Деликатесные Соевые соуса
ЛУЧШАЯ ПРИПРАВА К ЛЮБОМУ БЛЮДУ, ЗАКУСКЕ И БУТЕРБРОДУ
СОЯ „КАБУЛЬ“ и „ВОСТОК“
ТРЕСТ „СОЮЗПРОМСОЯ“ НАРКОМПИЩЕПРОМА СССР
ПРОДАЖА ВО ВСЕХ МАГ. „ГАСТРОНОМ“ „БАКАЛЕЯ“ и др. ОПТОВЫЕ ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ В ТРЕСТ „СОЮЗПРОМСОЯ“ МОСКВА НОВОСЛОБОДСКАЯ 7

Уп. Галоўлітбела № К—5632. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Б.